

НАПЕРАКОР СМЕРЦІ РАТАВАЛА ЖЫЦЦІ

7

МАЛАДЫ 555-ГАДОВЫ АСТРАВЕЦ

9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ЖНІЎНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 161 (30041)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Намеснік прэм'ер-міністра Пётр ПАРХОМЧЫК:**

*«Прэзідэнтам была пастаўлена жорсткая задача выпусціць сёлета 60 тысяч легкавых аўтамабіляў, і яна будзе безумоўна выканана. Ужо 40 тысяч аўтамабіляў выраблена і рэалізавана. Важная задача — лакалізацыя кампанентнай базы гэтых аўтамабіляў. Наступны год будзе вельмі складаны для кампаніі «БЕЛДЖЫ»: мы павінны стварыць за кароткі перыяд штамповачную вытворчасць, каб выраблялі усе кампаненты кузава для нашага прадпрыемства. Акрамя таго, трэба стварыць вытворчасць па зварцы канструкцый. Таму пераходзім да этапу стварэння дадатковых магутнасцяў з разліку 80 тысяч аўтамабіляў за год пры двухзменным рэжыме працы».*

# Водар «Бацькавай булкі»




Фота БелТА.

Фестываль з такой назвай у Свіслачы стаў своеасаблівым турыстычным брэндам, які ўжо другі год запар збірае гасцей з усёй краіны і нават замежжа. Нарадзілася гэтае свята пасля візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на мясцовую пякарню ў 2021 годзе. Свіслацкія майстры далі назву самай папулярнай пляцёнцы — «Бацькава булка». Сёлета свае работы на фестывалі прадставілі пекары з усёй краіны. Асаблівая ўвага — той самай «Бацькавай булцы». Майстар-клас па яе вырабе правялі для ўсіх ахвотных. У праграме фестывалю таксама любімыя гасцямі і ўдзельнікамі «Бацькава міля», экскурсія «Ад збожжа да хлеба», інтэрактыўная пляцоўка «Булка-варажбітка і ўсе-ўсе-ўсе», рэтра-танцпляцоўка Гродзенскай абласной філармоніі. І, вядома ж, паветра ў Свіслачы ў той дзень было напоўнена водарам свежага хлеба.

## КОРАТКА

• У Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця праекта «Школа кіравання». Праект з'яўляецца праграмай дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, якая дазваляе пасля яе паспяховага заканчэння быць залічаным у Акадэмію кіравання на бюджэтную форму навучання без здачы ўступных іспытаў. Аналагаў такога праекта ў краіне няма.

• **Мінінфарм запрашае да ўдзелу ў творчым конкурсе «Моцная сям'я — моцная дзяржава».**

• Парк дарожнай гаспадаркі Алтайскага краю папоўніўся 15 пагрузчыкамі АМКАДОР.

• **Паказ мод, навуковае шоу, пікнікі. «Першакласным святам» праводзяць лета ў Батанічным садзе Мінска.**

ISSN 1990 — 763X

23161>

9 771990 763008

Фінансы

## БІЗНЕС МЯСЦОВЫ — ІНТАРЭС ДЗЯРЖАЎНЫ

### Прадпрымальніцкі сектар краіны на прыкладзе сталіцы

**Мясцовы бізнес адыгрывае найважнейшую ролю ў фарміраванні эканомікі, павелічэнні спектра рэалізаваных тавараў і паслуг, стварэнні здаровага канкурэнтаздольнага асяроддзя не толькі ў асобным рэгіёне, але і ў краіне ў цэлым. Пра тое, як ідуць справы ў прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу ў сталіцы, ішла гаворка на прэс-канферэнцыі «Перспектывы развіцця мясцовага бізнесу і прадпрымальніцтва ў горадзе Мінску» .**

### Лідары са сталічнай прапіскай

Больш як 40 працэнтаў малых і сярэдніх арганізацый і амаль 30 працэнтаў індывідуальных прадпрымальнікаў краіны зарэгістраваны ў Мінску. На сёння 32 працэнты ўсіх занятых у сферы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, а гэта амаль паўмільёна чалавек, маюць сталічную прапіску. Згодна са статыстычнымі данымі, па выніках 2022 года Мінск застаецца абсалютным лідарам па ўзроўні развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва як па краіне ў цэлым, так і па ўкладзе сталічнага малога і сярэдняга бізнесу ў эканоміку горада. Пра гэта паведаміла **намеснік дырэктара Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Ірына БАБАЧОНАК**. Яна разгледзела развіццё ўсяго прадпрымальніцкага сектара краіны на прыкладзе сталіцы.

СТАР. 4

Прыёмная кампанія — 2023

## ПРАГРАМАВАННЕ, МЕДЫЦЫНА, МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ

### Якія спецыяльнасці цікавілі сёлетніх абітурыентаў і што з сёлетніх навацый захаваецца праз год?



**Сёлетняя ўступная кампанія амаль завершана, больш за 50 тысяч абітурыентаў 1 верасня зойме месцы ў студэнцкіх аўдыторыях. Яшчэ амаль 40 тысяч выпускнікоў школ паступілі ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Завяршаецца прыём дакументаў ва ўстановы прафтэхадукацыі, якія прапануюць больш за 250 прафесій. Пра асаблівасці сёлетняй уступнай кампаніі і яе вынікі расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей ПІШЧОЎ.**

### Рост цікавасці да педагагічнай прафесіі і традыцыйна высокі конкурс у медыцынскія ВНУ

Кіраўнік ведамства адзначыў, што прыёмная кампанія праводзілася з улікам пастаўленых кіраўніком дзяржавы задач па стварэнні справядлівых, роўных і празрыстых умоў для паступлення. Быў распрацаваны комплекс мерапрыемстваў, якія дазволіў убачыць матываваных, адораных і таленавітых абітурыентаў і стварыць для іх шэраг умоў для паступлення на абраныя спецыяльнасці і спецыяльнасці, запатрабаваныя эканомікай.

СТАР. 5

Меркаванні

# ЗАЯВЫ, ЯКІЯ ВЫЗНАЧАЮЦЬ ДАЛЕЙШЫ КУРС РАЗВІЦЦЯ ПАДЗЕЙ У ПЛАНЕТАРНЫМ МАШТАБЕ

## Беларускія парламентарыі пракаментавалі рэзанансное інтэрв'ю Прэзідэнта

**Размова Аляксандра Лукашэнкі з украінскай журналісткай Дзіянай Панчанка ўжо некалькі дзён знаходзіцца ў лідарах па папулярнасці на YouTube. За некалькі дзён — практычна пяць мільёнаў праглядаў, дзясяткі тысяч каментарыяў. Тэмы, якія ўзняў кіраўнік дзяржавы, адказваючы на пытанні журналісткі, — вострыя і актуальныя. Невыпадкова інтэрв'ю актыўна абмяркоўваецца на самых розных пляцоўках. Карэспандэнты «Звязды» сабралі меркаванні членаў Савета Рэспублікі і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.**

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ:**

— Сустрэча кіраўніка дзяржавы з журналістам з Украіны яшчэ раз прадэманстравала, наколькі глыбока Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь пагружаны ў тэматыку сітуацыі вакол Украіны. Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка таксама паказаў, што ён вельмі глыбока, усебакова аналізуе геапалітычную сітуацыю ў свеце і праз гэтую прызму — абстаноўку ў суседняй краіне, дзе працягвае ажыццяўляцца расійска-ўкраінскі канфлікт. Можна вылучыць шмат тэзісаў, якія і закрануў, і глыбока разгледзеў кіраўнік дзяржавы. Гэта і пытанні, звязаныя з зараджэннем гэтай сітуацыі ва Украіне, аб прычынах сітуацыі, якая склалася. Перш за ўсё — выснова аб тым, што калі ідзе працэс разбурэння дзяржаўнасці, дзяржаўных інстытутаў, калі пачынаецца прыватызацыя дзяржаўнай уласнасці ў інтарэсах асобных асоб, тады і адбываюцца такія дастаткова трагічныя, сумныя падзеі. У гутарцы Прэзідэнта з украінскім журналістам я хацеў бы вылучыць тэму ядзернай зброі. Гэта вельмі важная праблематыка. Вядома, што Рэспубліка Беларусь вярнула на сваю тэрыторыю тактычную ядзерную зброю. Мы пакуль не сталі кампенсаваць тую зброю, якая была вывезена ў 90-я гады, — маецца на ўвазе стратэгічная зброя. Ядзерная зброя з'яўляецца важным стрымлівальным фактарам, перш за ўсё ў адносінах да тых, хто, можа быць, задумвае агрэсію ў адносінах да Рэспублікі Беларусь. Мы маем поўную падставу так думаць і лічыць. І гэта звязана з нарошчваннем сур'ёзнага ўзбраення перш за ўсё на заходніх граніцах Рэспублікі Беларусь. Мы не можам не звярнуць увагу на тую падтрымку, якую аказваюць гэтым краінам Злучаныя Штаты Амерыкі пастаўкамі новых, найперш не абаронных, а наступальных узбраенняў. Прэзідэнт вельмі дакладна даў зразумець, што калі будзе агрэсія супраць Рэспублікі Беларусь, то наша краіна прыменіць увесь арсенал узбраенняў, які ёсць у яе, для таго каб адбіць гэты напад. Поўнасцю падтрымліваю кіраўніка нашай дзяржавы ў тым, што калі будзе агрэсія і з боку нашай паўднёвай суседкі, то мы прыменім усе ўзбраенні, якія неабходны для таго, каб забяспечыць тэрытарыяльную цэласнасць нашай краіны, суверэнітэт і незалежнасць. Але перш за ўсё, вядома, будуць нанесены папераджальныя ўдары або ўдары па цэнтрах прыняцця рашэнняў. І аб гэтым шчыра, адкрыта гаворыць кіраўнік дзяржавы. Лічу, што гэта правільны падыход, і пра яго павінны ведаць усе тыя, хто задумвае нейкія паходы на Усход праз Рэспубліку Беларусь.

**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Ігар ХЛАБУКІН:**

— Шчыры і адкрыты дыялог Прэзідэнта з украінскай журналісткай Дзіянай Панчанка, які датычыўся злабадзённых пытанняў геапалітычнага парадку дня, сведчыць аб непадробнай цікавасці ў большасці краін свету да меркавання беларускага лідара. Сёння наўрад ці можна знайсці палітыка і дзяржаўнага дзеяча ў ЗША і на Захадзе, які так адкрыта, з першых вуснаў, падзяліўся б з шырокай аўдыторыяй усімі тонкасцямі палітычных, эканамічных і ваенных працэсаў, якія адбываюцца ў свеце і ў прыватнасці ва Украіне, давёў бы да простага чалавека аб'ектыўную, праўдзівую інфармацыю, што адбываецца сёння на планеце. У ЗША і на Захадзе стала нормай жыцця гаварыць толькі тое, што выгадна асобным кіруючым колам і алігархічным класам, нахабна хлусіць, скажаючы рэальнае становішча ў рэгіёне, выдаваць жаданае за сапраўднае. Усё гэта падаецца пад соусам барацьбы за правы чалавека і сапраўднай дэмакратыі. А з улікам выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій маніпулявання грамадскай думкай і чалавечай свядомасцю, ва ўмовах татальнай інфармацыйнай і гібрыднай войн грамадзянам усё складаней разабрацца ў струмені інфармацыі, убачыць і распазнаць праўду, разабрацца ў сапраўдных пасылах і прычынах прыняцця тых ці іншых рашэнняў. Сустрэча ўкраінскай журналісткі з Прэзідэнтам і адказы на самыя складаныя, шматхадовыя пытанні стала той аддушынай, тым ветрыкам праўды, якога так доўга чакалі і якога сёння так не хапае простаму чалавеку. Кіраўнік дзяржавы сваім глыбокім, эмацыянальным інтэрв'ю, якое кранае душу, нанёс скрышальны ўдар па ворагу на інфармацыйным полі супрацьборства, сарваў маскі з тых, хто схаваўся за спіны, хто распальвае пажар вайны на планеце і раскідвае запалкі, ствараючы напружанасць у рэгіёне і на кантынентах.

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Фелікс ЯШКОЎ:**

— Зробленыя Прэзідэнтам заявы не толькі сенсацыйныя. Яны вызначаюць далейшы курс развіцця падзей у планетарным маштабе. Інтэрв'ю ўкраінскай журналістцы — гэта чарговая бліскучая перамога на палітычным полі нашага Прэзідэнта. Ён выразна даў зразумець: неўцягванне Беларусі ў лакальныя ваенныя канфлікты — гэта на сёння бясспрэчны і адзіны стрымлівальны фактар развязвання новай сусветнай вайны. І толькі недальнабачныя палітыкі могуць гэта не разумець. Гутарка атрымалася не толькі жывой, але і каштоўнай для наступнага аналізу экспертамі ў галіне палітычных, ваенных і дыпламатычных адносін. Адказваючы на пытанні інтэрв'ю, наш Прэзідэнт віртуозна падаў урок «заходнікам» і іх паслугачам у тым, наколькі прыстойнай і адкрытай павінна быць палітычная камунікацыя для эфектыўнага вырашэння спрэчак і канфліктаў, якія ўзнікаюць, — нават у фазе вострага супрацьстаяння. Аснoўны пасыл беларускага лідара сваім калегам — вучыцеся мець зносіны адзін з адным дзеля спакою на сваіх землях і дабрабыту ўласных народаў. Літаральна кожная рэпліка аргументавала той факт, што толькі адкрытасць да дыялогу і да стваральнага абмеркавання на міжнароднай арэне можа выратаваць нас усіх ад гібелі ў маральным і фізічным плане. Менавіта таму агульны тон гутаркі задавала цвёрдая міратворчая пазіцыя Прэзідэнта, які не на словах, а рэальнымі дзеяннямі ўжо дзясяткі гадоў дапамагае суседзям згладжваць вуглы і мудра абыходзіць стромкія віражы. Прытым заўсёды — па-бацькоўску ці па-сяброўску — падказваючы варыянты найбольш канструктыўнага вырашэння сітуацый, як паказвае далейшы вопыт.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ГАЙДУКЕВІЧ:**

— Мяне вельмі ўразіла інтэрв'ю Прэзідэнта. Акрамя праўдзівага аналізу сітуацыі, якая адбываецца, акрамя прагнозаў (а практыка паказала, што яны спраўджваюцца, і ўкраінскім палітыкам варта было б прыслухоўвацца да таго, што гаворыць беларускі лідар), я ўбачыў боль Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі за тое, што цяпер адбываецца ва Украіне, за ўвесь наш славянскі народ. Боль за рускіх, украінцаў, беларусаў, гэта наш агульны боль. Захаду ўдалося здзейсніць мару — развязаць вайну на постсавецкай прасторы. Амерыканцы самі баяцца ваяваць, у іх самая баязлівая армія, але яны заўсёды стваралі канфлікты па ўсім свеце. Але яны прайгралі: не змаглі знішчыць Беларусь у 2020 годзе, не змаглі Расію паставіць на калені. Упэўнены, што дзякуючы нашым лідарам мы здолеем сітуацыю ва Украіне пераламаць. Я ўбачыў у інтэрв'ю шчырыя перажыванні за ўкраінскі народ, клопат аб гэтай краіне, перажыванні за яе незалежнасць. На вялікі жаль, яна цяпер незалежнасць страціла. Аляксандр Лукашэнка думае на перспектыву і, улічваючы вопыт, здольны спрагназаваць лёс сваёй краіны праз 20–30 гадоў. Нам не патрэбныя менеджары ва ўладзе, як гэтага жадае Захад, нам патрэбен лідар нацыі, такі, які ёсць у Беларусі.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Алег ДЗЯЧЭНКА:**

— Кіраўнік нашай дзяржавы заўсёды ўдзяляў пільную ўвагу ўкраінскаму пытанню. У публічных выступленнях, у інтэрв'ю сродкам масавай інфармацыі, на сустрэчах з насельніцтвам, у вытворчых калектывах даваў аб'ектыўную адзнаку ўсім палітычным падзеям, якія амаль дзесяць гадоў скалынаюць братэрскую для нас рэспубліку. На працягу ўсяго перыяду канфрантацыі наш Прэзідэнт паслядоўна прапаноўваў бакам за сталом перагавораў урэгуляваць усе спрэчныя пытанні з улікам існуючых грамадска-палітычных рэалій. Відавочна, што немагчыма сёння ваенным шляхам вырашыць сітуацыю, якая склалася. Кожны дзень забірае жыцці тысяч вайскоўцаў з абодвух бакоў, знесена «ў нуль» эканоміка рэгіёна, разбурана грамадзянская інфраструктура, расце зганенне простых людзей. Мільёны бежанцаў з паўднёва-ўсходніх рэгіёнаў Украіны, якія ператварыліся ў поле бою, вымушаны шукаць выратавання за перыметрам межаў сваёй некалі квітнеючай радзімы. Дэмаграфічныя наступствы супрацьстаяння жахаюць сваім размахам. У гэтых умовах усё больш пашыраецца грамадскі запыт на ўсталяванне міру і бяспекі, спыненне ўсякага бессэнсоўнага кровапраліцця. Немалаважна, што заклік нашага Прэзідэнта вярнуцца да перамоўнага працэсу гучыць у Год міру і стваральнай працы. Гэты мірны меседж накіраваны, перш за ўсё, усім ваенна-палітычным элітам блізкага і далёкага замежжа, якія здзяйсняюць у той ці іншай форме ў гэтай братазабойчай вайне. Час спыніцца. Простым працаўнікам патрэбен мір. У рэчышчы сказанага неабходна яшчэ раз нагадаць аб шматлікіх ініцыятывах кіраўніка нашай дзяржавы, у якіх дакладна акрэслена гатоўнасць забяспечыць камфортныя ўмовы для правядзення перагавораў па дасягненні міру і згоды ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ:**

— У інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі традыцыйна адказы былі шчырымі, адкрытымі і падрабязнымі. Нягледзячы на мноства тэм, у мяне склалася ўражанне, што ўсё ж больш за ўсё гаварылі пра Украіну і для ўкраінцаў. Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што «Зяленскі — гэта не Украіна». Сапраўдны прэзідэнт не будзе знішчаць ва ўгоду ЗША ўласную нацыю, краіну. Менавіта ён, падштурхнуты Амерыкай, прывёў вайну ва ўласную хату. Ён вінаваты ў тым, што ўкраінскі народ проста выкарыстоўваюць, маніпулююць для адной толькі мэты — славянскія народы, забіваючы адзін аднаго, могуць аслабіць Расію. А вайна, якая доўга працягваецца, выгадная амерыканцам. І пры нарошчванні супрацьстаяння вынік можа быць толькі адзін — дзяржава Украіна перастане існаваць. Але ёсць і іншае выйсце — сесці за стол перагавораў і дамаўляцца, абмяркоўваючы ўсе вострыя праблемы. І яшчэ найважнейшую думку выказаў Аляксандр Лукашэнка аб тым, што крызіс ва Украіне пачаўся з аслаблення дзяржаўнай улады, узнікнення іншых цэнтраў прыняцця рашэнняў — алігархата і сілавікоў. Кожны цягнуў у свой бок, усе напляваі на краіну і народ. Людзі перасталі адчуваць падтрымку і ўдзел у іх лёсе дзяржавы. Гэта прывяло да расколу ў грамадстве. Таму наш Прэзідэнт шматразова паўтарае: беларусы, для захавання міру на тэрыторыі Беларусі трэба працаваць, адказна ставіцца да сваіх абавязкаў, «ваяваць» на працоўным полі. Бо бяспека пачынаецца першым чынам з эканомікі — гнуткай і ўстойлівай. А дзякуючы гэтаму дзяржава можа выконваць сацыяльную функцыю, накіраваную на стварэнне роўных магчымасцяў для развіцця асобы. Беларуская дзяржава ў адрозненне ад шматлікіх іншых гарантуе, забяспечвае, рэгулюе, стварае ўмовы. Пад абаронай дзяржавы знаходзяцца ўразлівыя катэгорыі грамадзян. Гэта ўсё магчыма толькі ў мірнай краіне. Таму глядзім па баках, робім высновы і працуем на карысць уласных сем'яў і краіны.

**Паводле БелТА і прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кіраўнікі больш як 40 дзяржаў прымуць удзел у саміце БРІКС

Саміт БРІКС стартуе ў Ёханесбургу (Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка) сёння, 22 жніўня, і прадоўжыцца да 24 жніўня. Пра тое, што лідары больш як 40 краін пацвердзілі свой удзел у мерапрыемстве, заявіў напярэдадні афіцыйны прадстаўнік МЗС ПАР Нэльсан Кгветэ, паведамляе ТАСС.

Прэзідэнт ПАР Сірыл Рамафоса ў звароце да нацыі ў сувязі з самітам БРІКС заявіў, што Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка падтрымлівае пашырэнне аб'яднання за кошт новых краін-членаў. Заяўкі на ўступленне ў БРІКС раней падалі больш за 20 краін.

Сірыл Рамафоса зазначыў, што намер многіх краін далучыцца да БРІКС сведчыць аб іх жаданні ўдзельнічаць у стварэнні больш справядлівай, узаемавыгаднай і збалансаванай сістэмы міжнародных адносін. Ён таксама падкрэсліў, што ПАР з'яўляецца прaціўнікам аднапалярнага свету. «Членства ў БРІКС адпавядае нашым нацыянальным інтарэсам, таму што БРІКС мяняе цяпер сусветную эканоміку і палітыку», — указаў ён.

Раней выданне Financial Times паведамляла, што Пекін на саміце БРІКС у Ёханесбургу, які мае адбыцца, закліча зрабіць аб'яднанне паўнавартасным сапернікам G7. Акрамя таго, лідары краін абмяркуюць павелічэнне долі разлікаў у нацыянальных валютах.

## У Літве фермеры асцерагаюцца з'яўлення ўкраінскага збожжа на рынку рэспублікі

Яны баяцца ўдару па іх эканамічных інтарэсах з-за прысутнасці ў краіне таннага збожжа з Украіны, паведамляе ТАСС са спасылкай на радыё LRT. Літоўскія фермеры апасаюцца з'яўлення на ўнутраным рынку ўкраінскага збожжа, якое прапануецца перагружаць у Клайпедскім дзяржаўным марскім порце для адпраўкі на экспарт. Пра гэта ў эфіры радыё LRT паведаміў старшыня асацыяцыі вытворцаў збожжавай прадукцыі рэспублікі Аўшрус Мацыяўскас.

«Мы асцерагаемся таго, што прызначанае на вываз украінскае збожжа можа застацца ў Літве, збіць рынчную цану і прывесці да страт. Цэны могуць упасці на трэць або нават палову. З Украінай мы канкураваць не ў стане», — сказаў ён.

Як паведаміў у ліпені генеральны дырэктар Клайпедскага порта Альгіс Латакас, дзяржпрадпрыемства здольна перагружаць 10 мільёнаў тон украінскага збожжа ў год. Нечаканай перашкодай стала пазіцыя Польшчы. Польскія фермеры таксама асцерагаюцца негатыўных наступстваў транспарціроўкі таннага збожжа з Украіны па чыгунцы ў Клайпеду. Вільнюс папрасіў Еўракамісію стаць пасярэднікам на перагаворах з Варшавай.

Жніво-2023

# ЯК ХЛЕБ ЗАГАРТОЎВАЕ

**На Гомельшчыне, нягледзячы на напружанасць уборачнай, у гаспадарках знаходзяць час на маленькія святы для душы. На палях і зернесушыльных комплексах аграрыі гэтымі днямі сустракалі актывістак Беларускага саюза жанчын. Падарункі і віншаванні гучалі ў адрас усіх працаўнікоў сяла, каго аб'яднала рэспубліканская акцыя «Хлеб на далонях жанчыны». Асаблівыя словы падзякі працаўніцам, якія шчыруюць не на перадавой у полі, а ў тыле, падтрымліваючы мужчын-аграрыяў у гаспадарках.**

## ВАЖНЕЙ ЗА ЎСЁ...

— Працуем кругласутачна: у дзве змены — з сямі да сямі і так па крузе. За адну змену прасушваем каля 130 тон збожжа, — сустракае **загадчыца зернесушыльнага комплексу аддзялення «Грабаўка» ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» Гомельскага раёна Ала ПЛАШКОВА**.

Гэта заслуга яе каманды — ідэальная чысціня на тэрыторыі збожжатока. Парадак не менш важны, чым стабільная работа самога зернесушыльнага комплексу. З сярэдзіны ліпеня да канца жніўня на гэтым участку — самая адказная пара.

— Збожжа праходзіць ачыстку і сушку, закладваецца на захоўванне, — тлумачыць Ала Плашкова. Тое, што ад іх працы залежыць якасць збожжа, яго захаванасць, дакладна разумеюць супрацоўнікі яе звяна.

На комплексе шэсць сховішчаў для высушанага зерня. Цяпер ужо чатыры з іх запоўнены. Пазней, у верасні, на комплекс будуць прывозіць і зерне кукурузы.

— Збожжа на тэрыторыі зернесушыльнага комплексу паступае ў завальную яму, потым у сартавальную машыну, дзе чысціцца ад сцябловых рэшткаў, а пасля накіроўваецца ў печ для прасушкі. За гэтым працэсам сочаць апаратары. Адпраўляем збожжа на захоўванне з вільготнасцю 14 працэнтаў. Вельмі адказная праца на ўсіх этапах у плане вядзення дакументацыі, — тлумачыць **вагаўшчыца зернесушыльнага комплексу аддзялення «Грабаўка» ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» Ала САЛОДКАЯ**.



Палявод аддзялення «Грабаўка» ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» Гомельскага раёна Алеся НІКАЛАЕНКА задзейнічана падчас уборачнай на зернесушыльным комплексе гаспадаркі.



Акрамя загадчыцы і дзвюх вагаўшчыц, якія працуюць пазменна, важнае звяно ў жаночым складзе супрацоўнікаў комплексу — паляводы.



Паляводы Алена ЯЗЕРСКАЯ, Алеся НІКАЛАЕНКА, Наталля КЕЗІКАВА і Наталля МАГЕР.

— Мы — за чысціню! — эмацыянальна прадстаўляюцца работніцы. Прызнаюцца: першы раз у жыцці даюць інтэрв'ю, але дыктафона не пужаюцца, гавораць бойка.

— Праца складаная, але адносна, — упэўненыя паляводы Наталля Кезікава, Наталля Магер, Алена Язерская і Алеся Нікалаенка.

Наталля Кезікава і Алена Язерская ў гаспадарцы — з канца 1980-х гадоў. «З мінулага стагоддзя», — смяюцца.

Другая Наталля і Алеся працуюць паляводамі каля дзесяці гадоў. Алеся Нікалаенка пераехала з Гомеля жыць і працаваць у вёску і знайшла сябе менавіта ў сельскай гаспадарцы.

У паляводчай брыгадзе жанчыны задзейнічаны ў розных работах у залежнасці ад сезона.

— Праца падчас уборачнай на збожжатоку адказная. Трэба глядзець, каб розныя сарты не змешваліся, каб збожжа ляжала кампактнымі кучамі. Пасля загрузкі ў коўш пагрузчыка, які транспартуе зерне ў завальную яму, неабходна падграбаць яго шуфлямі. Сочым і за чысцінёй тэрыторыі тока, — тлумачаць працаўніцы.

Каманда рупліўцаў на зернесушыльных комплексах — складаны механізм. Кожны працаўнік — важнае звяно.

— Без мужчынскага пляча тут — нікуды, — падкрэсліваюць жанчыны.

На самых складаных участках зернесушыльнага комплексу задзейнічаны мужчыны. Працуюць непасрэдна з зернесушыльным абсталяваннем, абслугоўваюць механічную частку слесары, адказваюць за сушку апаратары. Пагрузка і выгрузка збожжа — зона адказнасці вадзіцеляў і трактарыстаў.

## СЛОВЫ ПАДЗЯКІ

На працоўным месцы, на зернесушыльным комплексе аграрыі прымалі падарункі і віншаванні ад Гомельскага раённага Савета дэпутатаў і аб'яднання прафсаюзаў, раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

— Мне прыемна знаходзіцца на вашым сельгаспрадпрыемстве з ганаровай місіяй — ушанаваць чалавека працы. Дзякуючы вам на сталах беларусаў будзе ляжаць духмяны хлеб, — звярнулася **старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў, лідар раённай арганізацыі Беларускага саюза жанчын Вікторыя ЛАДУЦЬКА**. — У разгар уборачнай кампаніі вам даводзіцца працаваць нават ноччу. І пры гэтым знаходзіце час і сілы на хатнія справы, падрыхтоўку дзяцей да школы. Шчыра захапляемся вашымі працавітасцю і адказнасцю.

Праца на зернесушыльных комплексах патрабуе максімальнай дысцыпліны і адказнасці, захавання тэхнікі бяспекі, звярнула ўвагу **старшыня Гомельскага раённага аб'яднання прафсаюзаў Ларыса ЛЕГЛІК**.

— Для работнікаў нашых гаспадарак заўсёды важна, што праца іх бяспечная, а на працоўных месцах забяспечана ўсё неабходнае для супрацоўнікаў, — дадала прафсаюзны лідар Гомельскага раёна.

## ЛІЧБЫ

Найлепшыя ў раёне паказчыкі па сушцы збожжа паказалі апаратары зернесушыльнага комплексу «Птушкафабрыкі «Рассвет» — Міхаіл Кісялёў, Дзмітрый Нікіцін, Аляксандр Кашчэеў. Гаспадарка ў гэтую ўборачную кампанію па аб'ёмах высушанага збожжа — першая ў Гомельскім раёне і ў лідарах па вобласці. Іх паказчык больш за пяць тысяч тон высушанага збожжа.

— У раёне ўбрана 95 % плошчаў зерневых і зернебабовых культур. Пяць гаспадарак ужо завяршылі ўборку збожжавых каласавых і рапсу. У цэлым ва ўборачнай кампаніі ў сельгасарганізацыях задзейнічаны 57 экіпажаў. Шэсць вадзіцеляў перавезлі больш за тысячу тон збожжа, а на рахунку вадзіцеля ААТ «Агракамбінат «Паўднёвы» Ігара Марозава — больш за тры тысячы тон збожжа. Гэта найлепшы вынік у вобласці, — адзначыў **старшыня Гомельскай раённай арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Аляксандр ГРЫНЬКОЎ**.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

На кантролі

# АПТЭЧКУ, ХАРЧАВАННЕ І... ПАРУШЭННІ НА ЖНІВЕ

## Правярае тэхінспекцыя Федэрацыі прафсаюзаў

**Забяспечанасць работнікаў аграпрамысловага комплексу сродкамі індывідуальнай аховы, спецадзеннем, медыцынскімі аптэчкамі і сродкамі першаснага пажаратушэння, стан сельскагаспадарчай тэхнікі, эксплуатацыя абсталявання ў мехмайстэрнях і на зернесушыльных камбінатах — усе гэтыя моманты па вытрымліванні норм аховы працы ў час жніва тэхнічная інспекцыя Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) пачала правяраць задоўга да ўборачнай кампаніі (да яе пачатку было выяўлена больш за 1600 хібаў), працягваецца работа і цяпер, але ж парушэнні ўсё роўна ёсць, адзначылі ў федэрацыі.**



Спецыялісты ФПБ кантралююць таксама пытанні забеспячэння работнікаў гарачым харчаваннем і пітной вадой, правяраюць стан санітарна-бытавых памяшканняў і іншае. Пры гэтым аграпрамысловы комплекс, як і раней, застаецца адной з галін, дзе рэгіструецца найбольшая колькасць няшчасных выпадкаў. Летась па выніках грамадскага кантролю падчас жніва было зафіксавана каля 3400 парушэнняў заканадаўства аб ахове працы, прыпынена эксплуатацыя больш як 250 адзінак абсталявання, якія не адпавядалі патрабаванням бяспекі і маглі стаць прычынай траўміравання работнікаў.

— Маніторынгі і праверкі вытрымлівання заканадаўства аб ахове працы ў сельгасарганізацыях, якія пачаліся яшчэ да жніва, дазволілі ўстараніць многія выяўленыя парушэнні да пачатку кампаніі. Тым не менш, і цяпер мы працягваем фіксаваць тыя ці іншыя выпадкі парушэння норм аховы працы, — расказаў **галоўны тэхнічны інспектар працы ФПБ Павел МАНЬКО**. — Так, сустракаюцца прыклады неналежнага стварэння ўмоў працы з боку наймальніка, недастатковага сур'ёзнага стаўлення да правілаў і нормаў у сферы аховы працы саміх работнікаў. Аднак невыкананне нават, як камусьці можа здацца, нязначнага пункта правіл тэхнікі бяспекі можа прывесці да вялікай трагедыі.

Спецыялісты тэхінспекцыі не толькі наведваюць арганізацыі з праверкамі і маніторынгамі, але і аказваюць кансультатыўную дапамогу, праводзяць навучальныя мерапрыемствы, скіраваныя на прафілактыку вытворчага траўматызму, далучаюцца да вырашэння праблемных пытанняў пры арганізацыі гарачага харчавання і забеспячэння абсталяваннем пры ўкамплектаванні пакояў прыёму ежы, запэўнілі ў ФПБ.

Па выніках праверак прафсаюзы выдаюць наймальнікам прадстаўленні і рэкамендацыі з вызначанымі тэрмінамі ўстаранення выяўленых парушэнняў і маніторыць вынікі. У Федэрацыі прафсаюзаў працягвае працаваць «гарачая лінія» па пытаннях вытрымлівання заканадаўства аб ахове працы. Аб існуючых парушэннях можна паведаміць па тэлефоне 8 (017) 374 90 48.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

Надвор'е

# ГАРАЧЫНЯ АДСТУПАЕ

**Дажджы, навальніцы і да плюс 33 градусаў абяцаюць сіноптыкі ў Беларусі з 22 да 27 жніўня. Аб гэтым паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду, 23 жніўня, будзе пераважна без ападкаў, толькі днём месцамі па поўначы краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах згусціцца слабы туман. Тэмпература паветра ноччу будзе ў межах ад плюс 8 да плюс 15 градусаў, а днём — ад 20 да 27 градусаў вышэй за нуль.

У чацвер, 24 жніўня, месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы, днём магчымы навальніцы. Уначы і раніцай месцамі — слабы туман. Тэмпература паветра ўначы падымецца да 8—15 градусаў, а днём будзе вагацца ад плюс 18 градусаў па поўначы да плюс 27 градусаў па поўдні.

У пятніцу, 25 жніўня, ноччу будзе пераважна без ападкаў. Днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу і раніцай слабы туман. Уначы будзе 7—14 градусаў цяпла, а днём — плюс 20—27 градусаў. На паўднёвым захадзе ноччу тэмпература дасягне 15—17 градусаў вышэй за нуль, а днём — плюс 28—29 градусаў.

Згодна з папярэднім прагнозам сіноптыкаў, у гэтыя выхадныя ініцыятыву ў надвор'і перахопяць атмасферныя франты з Заходняй Еўропы. Яны абумовяць кароткачасовыя дажджы ўжо ў большасці раёнаў краіны, месцамі прагрымяць навальніцы. Пры гэтым будзе захоўвацца цёплае для гэтага перыяду надвор'е.

# БІЗНЕС МЯСЦОВЫ — ІНТАРЭС ДЗЯРЖАЎНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Указаныя суб'екты гаспадарання выпрацоўваюць пятую частку ўсёй прамысловай вытворчасці па сектары МСП (малога і сярэдняга прадпрымальніцтва), забяспечваюць прыкладна 36 працэнтаў рознічнага тавараабароту і палову таваразвароту грамадскага харчавання. Суб'екты МСП Мінска фарміруюць больш як 34 працэнты экспартнай выручкі ад продажу тавараў. «Прыведзеныя мной даныя сведчаць аб тым, што малы і сярэдні бізнес сталіцы сёння займае верхні радок у рэйтынгу рэгіёнаў па развіцці прадпрымальніцтва», — пракаментавала прыведзеныя статыстычныя даныя намеснік дырэктара Дэпартамента па прадпрымальніцтве Мінэканомікі. Па гэтай прычыне абмеркаванню перспектыў развіцця малога і сярэдняга бізнесу і прадпрымальніцтва ўдзяляецца шмат увагі.

## Фарміруючы гарадскі бюджэт

Паступленні ад суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва фарміруюць значную частку гарадскога бюджэту. «У бюджэт Мінска ад суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва па выніках першага паўгоддзя гэтага года паступіла ўжо каля Br3,5 млрд. Удзельная вага гэтых паступленняў у агульных паступленнях горада складае больш як 36 працэнтаў», — расказала **начальнік аддзела прадпрымальніцтва камітэта эканомікі Мінгарвыканкама Ганна САХАРАВА**.



Было адзначана, што развіццю і падтрымцы прадпрымальніцтва ў Мінску ўдзяляецца асаблівая ўвага. Так, сёння ў сталіцы працуюць звыш 111 тысяч суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу, сярод якіх каля 39 тысяч малых і сярэдніх прадпрыемстваў і 72 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў. З гэтай колькасці 13 тысяч суб'ектаў гаспадарання вядуць знешнеэканамічную дзейнасць.

З кожным годам колькасць зарэгістраваных камерцыйных арганізацый у сталіцы павялічваецца. Так, у студзені — чэрвені бягучага года зарэгістравана больш як 2,8 тысячы камерцыйных арганізацый — на 530 больш, чым у аналагічны перыяд летась.

## Ісці разам плячо ў плячо

Штогод у гарадскім бюджэце Мінска прадугледжваюцца сродкі на падтрымку дзелавой актыўнасці. Сёлета ў Мінгарвыканкам па аказанне дзяржаўнай фінансавай падтрымкі ўжо звярнуліся больш за 20 суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Ганна Сахарава распавяла аб відах і спосабах дзяржаўнай падтрымкі сталічнага бізнесу.

У Мінску, як і ў іншых рэгіёнах краіны, дзейнічае дзяржаўная праграма «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва» на 2021—2025 гады, у рамках якой прадугледжаны шэраг інструментаў падтрымкі. Акрамя гэтага, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, паводле слоў Ганны Сахаравай, дае такія віды дзяржаўнай фінансавай падтрымкі, як субсідзіраванне працэнтных ставак па крэдытах, лізінгавых плацяжах і затрат на ўдзел у выставачна-кірмашовых мерапрыемствах.

Аказвае сталічная мэрыя і маёмасную падтрымку бізнесу. Горад прымае неабходныя меры па ўстанаўленні плошчаў прамысловых прадпрыемстваў, якія не выкарыстоўваюцца або неэфектыўна выкарыстоўваюцца, а таксама выяўленні рэзерваў, што даюць магчымасць павысіць інвестыцыйную прывабнасць сталіцы. Як растлумачыла Ганна Сахарава, маёмасная падтрымка суб'ектам прадпрымальніцтва ў Мінску аказваецца шляхам выдзялення аб'ектаў нерухомай маёмасці, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці, у арэнду, у тым ліку ў бязвыплатнае карыстанне пад афармленыя дагаворам абавязацельствы па стварэнні рабочых месцаў.

Для аказання садзейнічання малому і сярэдняму бізнесу ў Мінску дзейнічае разгалінаваная сетка інфраструктуры. Гэта 21 цэнтр падтрымкі і тры інкубатары малога прадпрымальніцтва. Паслугамі цэнтраў падтрымкі сёлета ўжо скарысталіся больш як 30 тысяч кліентаў, з іх больш як пяць тысяч на бязвыплатнай аснове. З мэтай стымулявання дзелавой ініцыятывы і развіцця адпаведных кампетэнцый у маладзёжным інкубатары малога прадпрымальніцтва «Маладзёжная сацыяльная служба» была арганізавана школа прадпрымальнікаў.

Па словах Ганны Сахаравай, адзін з найбольш важных рычагоў развіцця бізнесу — інфармацыйная падтрымка. На сайце Мінгарвыканкама створаны рэсурс «Бізнес-партал Мінска», дзе сканцэнтраваны і рэгулярна актуалізуюцца пытанні развіцця і падтрымкі прадпрымальніцтва. Навіны бізнесу сталіцы актыўна асвятляюцца ў сацсетках, рэспубліканскіх і гарадскіх СМІ, на сайтах адміністрацый раёнаў Мінска.

Для суб'ектаў гаспадарання ў Мінгарвыканкаме рэгулярна праводзяцца сустрэчы-семінары. У мэрыі ўжо прайшло 12 семінараў па пытаннях падаткаабкладання для суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці, рамеснікаў і фізічных асоб. Пракансультавацца суб'екты малога і сярэдняга бізнесу могуць і па прамых тэлефонных лініях.

Пры Мінгарвыканкаме створаны і актыўна функцыянуе Савет па развіцці прадпрымальніцтва, куды ўваходзяць прадстаўнікі сталічнага бізнесу розных відаў эканамічнай дзейнасці. Штомесяц праводзяцца пасяджэнні савета, на якіх абмяркоўваюцца праблемныя пытанні, што хваляюць сталічны бізнес. Па выніках пасяджэння выпрацоўваюцца канкрэтныя рашэнні. Пры неабходнасці Мінгарвыканкам накіроўвае прапановы бізнес-супольнасці ў іншыя ведамствы па кампетэнцыях.

Ганна Сахарава запэўніла, што гарадскія ўлады імкнуцца ісці плячо ў плячо з бізнесам. «Ва ўзаемаадносінах улады і бізнесу не павінна быць якога-небудзь дыскамфорту. Органы дзяржаўнай улады павінны быць для бізнесу партнёрамі. Мы ведаем, што ў бізнесу часта бываюць розныя перыяды, бо прыватны бізнес спалучаны з рызыкамі, таму самае галоўнае ў складаных перыядах — стаць партнёрамі».

## Быць флагманам развіцця рэгіёнаў

Намеснік дырэктара Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Ірына Бабачонак адзначыла, што ў развіцці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Беларусі ёсць яўны рэгіянальны дысбаланс. Па гэтай прычыне адным з найважнейшых кірункаў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на бягучую пяцігодку з'яўляецца прыняцце мер па згладжванні існуючага дысбалансу і атрыманні дадатковых магчымасцяў для актывізацыі прадпрымальніцкай ініцыятывы ў рэгіёнах. Пры гэтым было падкрэслена, што, мабыць на мэце развіццё бізнесу ў рэгіёнах, Мінэканомікі не мае намеру пакідаць сталічны бізнес убаку.

«Размова ідзе аб выбудоўванні збалансаванай сістэмы, пры якой у бізнесу Мінска з'яўляецца асаблівая, вельмі важная місія. Мы гаворым аб тым, што сталіца павінна быць арыентавана на фарміраванне ў цэнтры краіны буйнога навукова-інавацыйнага, адміністрацыйнага і фінансавага ядра, выступаючы флагманам і лакаматывам для развіцця ўсіх астатніх тэрыторый».

Паводле слоў прадстаўніцы Мінэканомікі, у краіне ўжо існуе і паспяхова функцыянуе шэраг кірункаў па падтрымцы прадпрымальніцкай ініцыятывы. Такую работу праводзяць спецыялізаваныя структуры ў выглядзе Цэнтраў падтрымкі і інкубатараў. Фінансавую падтрымку прадпрымальнікам аказвае Банк развіцця, як таксама можна атрымаць у рамках дзяржаўнай праграмы «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «СМАЧНАЯ ВОСЕНЬ СА «ЗВЯЗДОЙ»

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Смачная восень са «Звяздой» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 1 верасня 2023 года да 31 снежня 2023 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2023 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт., з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Кухонны камбайн Holt HT-FP-002 (далей — суперпрыз) | 1 | 165,04 | 165,04 |
| 2 | Міксер SCARLETT SC-HM40S 16 Family Life (далей — прыз) | 7 | 48,00 | 336,00 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» складае: 501,04 (пяцьсот адзін) рубель 04 капейкі.

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Рэкламная гульня «Смачная восень са «Звяздой» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2023 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2023 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 1 верасня да 20 кастрычніка 2023 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 верасня да 20 кастрычніка 2023 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 26 кастрычніка 2023 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні «Смачная восень са «Звяздой» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Южык Жанна Міхайлаўна — галоўны тавараз навец РУП «Белдрук»;

Ганцарэвіч Святлана Міхайлаўна — загадчык аддзела рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ**

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 27 кастрычніка 2023 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз (суперпрыз), лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 4 лістапада 2023 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 4 лістапада 2023 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2023 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2023 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2023 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 31 снежня 2023 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефоне (017) 271 81 53, 311 17 40, для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 снежня 2023 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах (017) 271 81 53, 311 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4348 ад 15.08.2023 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

# ПРАГРАМАВАННЕ, МЕДЫЦЫНА, МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ




Фота Лізаветы ГОЛАД.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Нагадаем, што агульны план прыёму сёлета складаў 52,2 тысячы выпускнікоў школ, у тым ліку 28,4 тысячы планавалася прыняць за кошт сродкаў бюджэту, а 23,8 тысячы — на платную форму навучання. У параўнанні з 2022 годам план прыёму сёлета на бюджэтную форму павялічаны на 600 месцаў, а вось на платную форму скараціўся на 1,5 тысячы.

Такім чынам, у 44 дзяржаўныя ВНУ залічана 27,1 тысяча абітурыентаў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Сярэдні конкурс па краіне склаў 1,4 чалавека на месца. Кантрольныя лічбы прыёму выкананы на 98 %. Прыём на завочную форму за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту будзе праведзены з 15 лістапада да 30 снежня. Плануецца прыняць каля 700 чалавек.

У параўнанні з мінулым годам выраслі прахадныя балы па большасці спецыяльнасцяў. Максімальныя прахадныя балы зафіксаваны па такіх спецыяльнасцях, як «Міжнароднае права» ў БДУ (398), «Стаматалогія» ў БДМУ (395), «Праграмная інжынерыя» ў БНТУ і БДУІР (394), IT-спецыяльнасці традыцыйна карысталіся вялікім попытам.

— Назіралася павышэнне цікавасці ў абітурыентаў да педагагічных спецыяльнасцяў, што пацвярджаецца павелічэннем конкурсу, прахадных балаў, ростам колькасці выпускнікоў педагагічных класаў, якія паступілі на гэтыя спецыяльнасці. Традыцыйна вялікая колькасць абітурыентаў падала дакументы ў медыцынскія ВНУ. У іх у сярэднім конкурс склаў больш за два чалавекі на месца, а па некаторых спецыяльнасцях дасягаў 12. Адзначана і павышэнне балаў, напрыклад, на «Стаматалогію» ў БДМУ парог склаў 395 балаў, — расказаў Сяргей Пішчоў.

### У ВНУ — праз універсітэцкую алімпіяду

Сёлета былі пашыраны магчымасці для паступлення адораных і матываваных абітурыентаў, якія дасягнулі высокіх вынікаў у школе. Дарэчы, у ВНУ падало дакументы больш за 3,3 тысячы медалістаў. Сёлета таленавітыя выпускнікі маглі паўдзельнічаць і ва ўніверсітэцкіх алімпіядах, перамога ў якіх давала права на залічэнне ў ВНУ. Іх правялі 18 рэгіянальных ВНУ, а 369 пераможцаў сталі студэнтамі.

— Каля 30 % з такіх абітурыентаў паступіла на найбольш запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці, каля 50 % пераможцаў скончыла школы раённых цэнтраў і сельскай мясцовасці, 62 % маюць сярэдні бал атэстата вышэй за 9 і каля 75 % пераможцаў паступіла ў ВНУ свайго рэгіёна, — прывёў лічбы Сяргей Пішчоў. — Усё гэта сведчыць пра неабходнасць і ў будучым праводзіць універсітэцкія алімпіяды. Таксама разглядаецца магчымасць пашырэння пераліку спецыяльнасцяў для залічэння іх пераможцаў.

Адным з новаўвядзенняў сёлетняй прыёмнай кампаніі стаў новы фармат для паступлення мэтавікоў. Гэта і павелічэнне квот на вылучэнне мэтавых месцаў, і зняцце тэрытарыяльных абмежаванняў для арганізацый-заказчыкаў, і вынясенне тэрмінаў дадзенай кампаніі за рамкі асноўнага прыёму. Адпаведны прыём ажыццяўляўся з 1 да 16 чэрвеня ў 30 ВНУ. На ўмовах мэтавай падрыхтоўкі залічана каля 3,5 тысячы абітурыентаў пры плане прыёму 4,5 тысячы (план прыёму выкананы на 77 %).

Адметна, што педагагічныя, медыцынскія, а таксама ВНУ, якія рыхтуюць спецыялістаў у галіне культуры, спорту і фізічнай культуры, выканалі мэтавы прыём на 90—100 %. У крыху меншых аб'ёмах справіліся сельскагаспадарчыя і транспартныя ВНУ.

— Мы бачым прамую залежнасць матывацыі абітурыента ад ўзроўню прафарыентацыйнай работы заказчыкаў кадраў. Такую работу неабходна развіваць і надалей, — дадаў прадстаўнік Міністэрства адукацыі.

### Стаматалогія і праграмаванне — самыя запатрабаваныя ў платнікаў

На платную форму навучання сёлета прымала абітурыентаў 49 ВНУ. Планавалася залічыць 23,8 тысячы чалавек, аднак фактычна прынялі крыху менш — план выкананы на 93,5 %. Пры гэтым некаторыя ВНУ правялі залічэнне і звыш кантрольных лічбаў прыёму. Максімальныя прахадныя балы на платную форму зафіксаваны на спецыяльнасць «Стаматалогія» БДМУ (381), «Праграмная інжынерыя» ў БДУІР (361), «Міжнародныя адносіны» ў БДУ (357). На платнай форме навучання сёлета таксама адзначаўся рост конкурсу і прахадных балаў.

### Максімальныя балы — у юрыдычным каледжы

Для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі сёлета можна было абраць 156 навучальных устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі і 37 іншых навучальных устаноў, якія працуюць па такіх праграмах. Залічэнне адбывалася на аснове сярэдняга бала атэстата. Планавалася прыняць 39,6 тысячы чалавек, у тым ліку 27,4 тысячы — за кошт бюджэту, 12,2 тысячы — на платнай аснове, што складае каля 92 % ад плана прыёму мінулага года. Максімальныя конкурсы зафіксаваны на спецыяльнасцях «Архітэктурны дызайн гарадскога асяроддзя» і «Дызайн» (больш за 4 чалавекі на месца), «Архітэктурнае праектаванне» (больш за 2,5 чалавека на месца).

А вось максімальныя прахадныя балы склаліся ў юрыдычным каледжы БДУ на спецыяльнасці «Правазнаўства» (ад 9,8 да 10 балаў) і філіяле БДУІР па спецыяльнасці «Распрацоўка і суправаджэнне праграмнага забеспячэння інфармацыйных сістэм» Мінскага радыётэхнічнага каледжа (каля 10 балаў).

Найбольшая ж колькасць бюджэтных месцаў запланавана па такіх профілях, як інжынерная, апрацоўчая, будаўнічая галіны, ахова здароўя, сацыяльная абарона, сельская, лясная, рыбная гаспадаркі, ветэрынарыя, педагогіка. Гэтыя спецыяльнасці найбольш запатрабаваныя ў заказчыкаў кадраў.

Асаблівасцю бягучага года стаў і прыём на дыстанцыйную форму навучання.

У навучальныя ўстановы, якія рэалізоўваюць праграмы прафтэхадукацыі, прыём сёлета вядуць 159 устаноў адукацыі, у тым ліку 154 каледжы, чатыры ВНУ і Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі. Ажыццяўляецца прыём дакументаў на атрыманне адукацыі па больш чым 250 прафесіях. Найбольшая колькасць месцаў вылучана па такіх профілях, як інжынерная, апрацоўчая, будаўнічая галіны, сельская, лясная і рыбная гаспадаркі, ветэрынарыя. Спецыяльнасці рэальнага сектара эканомікі ў структуры прыёму складаюць каля 75 %.

— Міністэрства адукацыі сумесна з зацікаўленымі рэалізавала комплекс мерапрыемстваў, якія дазволілі ўбачыць абітурыентаў, што маюць матывацыю, адораных і добра падрыхтаваных. Прапанаваныя навацыі дазволілі вырашыць задачу па прыцягненні абітурыентаў у ВНУ з улікам іх пераваг, а таксама па патрэбах арганізацый — заказчыкаў кадраў. Праводзяцца сустрэчы па абмеркаванні вынікаў уступнай кампаніі, праведзены круглыя сталы і дыялогавыя пляцоўкі з прадстаўнікамі ВНУ, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, арганізавана анкетаванне абітурыентаў, бацькоў, педагогаў, каб выпрацаваць рэкамендацыі па ўдасканаленні прыёмнай кампаніі наступнага года, — рэзюмаваў Сяргей Пішчоў.

**Алена КРАВЕЦ.**

# НОВЫЯ ЧЛЕНЫ ЎНІВЕРСІТЭЦКАЙ СЯМ'І

**СЁЛЕТА ў Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ефрасінні Полацкай каля 900 абітурыентаў падало дакументы ў прыёмную камісію для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту на дзённай, завочнай і завочнай скарочанай формах. Аб выніках прыёмнай кампаніі расказаў рэктар Полацкага ўніверсітэта Юрый Яцэнтавіч РАМАНОЎСКІ.**



Фота psu.by

***— Колькі абітурыентаў сёлета залічана на бюджэтную і платную формы навучання?***

— На бюджэтную форму залічаны 586 абітурыентаў як на дзённае, так і завочнае аддзяленні з поўным і са скарочаным тэрмінамі навучання. На ўмовах аплаты вучэбнага працэсу былі залічаны 409 абітурыентаў усіх формаў навучання.

***— Якія спецыяльнасці сёлета аказаліся найбольш запатрабаванымі? На якой склаўся самы вялікі конкурс?***

— Найбольш запатрабаванымі сталі спецыяльнасці сацыяльна-гуманітарнай накіраванасці, эканамічнага профілю і IT-сферы. Найбольшы конкурс за кошт сродкаў бюджэту па выніках прыёму дакументаў на дзённую форму навучання склаўся па спецыяльнасцях «Правазнаўства» — 5,6 чалавека на месца, «Графічны дызайн і мультымедыйны дызайн» — 4,75 чалавека на месца, «Бізнес-адміністраванне» — чатыры чалавекі на месца.

***— Сёлета ў пераможцаў шматпрофільнай універсітэцкай алімпіяды была магчымасць паступіць без экзаменаў на некаторыя спецыяльнасці. Якія гэта спецыяльнасці і колькі чалавек скарысталіся такой магчымасцю?***

— Сапраўды, сёлета магчымасцяў паступіць без уступных іспытаў у абітурыентаў стала больш, я б сказаў, што галоўнай навацыяй уступнай кампаніі стала яе этапнасць. Адзін з такіх этапаў — ужо ў сакавіку некаторыя абітурыенты ведалі, што сталі студэнтамі. Паступіць без экзаменаў стала магчыма дзякуючы перамозе ў шматпрофільнай універсітэцкай алімпіядзе. Сёлета ўніверсітэт правёў алімпіяды па васьмі вучэбных прадметах, а абітурыенты мелі магчымасць стаць студэнтамі па 15 спецыяльнасцях: гэта «Дашкольная адукацыя», «Сацыяльна-педагагічная і псіхалагічная адукацыя», «Тэхналагічная адукацыя», «Адукацыя ў галіне фізічнай культуры», «Гісторыя», «Рамана-германская філалогія», «Камп'ютарная фізіка», «Трубаправодны транспарт, захоўванне нафты і газу», «Тэхналагічныя машыны і абсталяванне», «Вытворчасць вырабаў на аснове трохвымерных тэхналогій», «Перапрацоўка нафты і газу і прамысловы арганічны сінтэз», «Эксплуатацыя наземных транспартных і тэхналагічных машын і комплексаў», «Геадэзія, электраэнергетыка і электратэхніка», «Інжынерныя сеткі, абсталяванне будынкаў і збудаванняў».

У першым завочным туры ўзялі ўдзел 368 абітурыентаў, з іх 348 прайшлі ў другі вочны тур, па яго выніках 30 пераможцаў шматпрофільнай універсітэцкай алімпіяды скарысталіся магчымасцю льготнага залічэння ва ўніверсітэт без уступных выпрабаванняў.

***— Колькі абітурыентаў-пераможцаў абласнога этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах паступіла на бюджэт без экзаменаў?***

— Вялікая ўвага ва ўніверсітэце аддаецца прыцягненню на навучанне адораных і таленавітых дзяцей з мэтай іх наступнага замацавання на работу ў рэгіёне. Безумоўна, выдатнікі розных этапаў рэспубліканскай алімпіяды школьнікаў з'яўляюцца такімі, тым больш наш рэгіён славіцца сваімі пераможцамі. Прыход падобных прадстаўнікоў моладзі на вучобу — як гонар, так і адказнасць універсітэта. Сёлета тры абітурыенты, якія з'яўляюцца ўладальнікамі дыпломаў I, II, III ступені на трэцім (абласным) этапе рэспубліканскай алімпіяды, залічаны без уступных выпрабаванняў на спецыяльнасці, для якіх адным з профільных прадметаў вызначаны прадмет іх алімпіяды.

***— Колькі ў працэнтных суадносінах залічана абітурыентаў з Віцебскай вобласці і іншых рэгіёнаў краіны?***

— Наш універсітэт як рэгіянальная ўстанова вышэйшай адукацыі вядзе мэтанакіраваную работу па фарміраванні кадравага патэнцыялу вобласці. Мы не проста прыцягваем на навучанне ва ўніверсітэт абітурыентаў з нашага рэгіёна, але і размяркоўваем, працаўладкоўваем выпускнікоў на прадпрыемствы і ў арганізацыі паўночнага рэгіёна. Так, з Віцебскай вобласці залічана найбольшая колькасць абітурыентаў — 83,6 працэнта, на другім месцы Мінская вобласць — 10,3 працэнта. З Магілёўшчыны да ўніверсітэцкай сям'і сёлета далучылася 3,5 працэнта, з Гомельскай — 2,8, з Брэсцкай — 1,4, з Гродзенскай — 2,6 працэнта.

***— Ці павялічылася сёлета колькасць абітурыентаў на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі? На якія спецыяльнасці?***

— План прыёму на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ў 2023 годзе павялічыўся амаль на 30 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам. Гэта спецыяльнасці як педагагічнай накіраванасці, такія як «Сацыяльна-педагагічная і псіхалагічная адукацыя», «Адукацыя ў галіне фізічнай культуры», «Гісторыя», «Рамана-германская філалогія», так і юрыдычнага профілю: «Правазнаўства» і «Мытная справа».

***— Сёлета ў Полацкім дзяржаўным універсітэце быў адкрыты дадатковы набор?***

— Дадатковы набор сёлета не аб'яўляўся. Прыемна адзначыць, што наш універсітэт папулярны сярод моладзі, на многіх спецыяльнасцях сфарміраваны высокі конкурс. Я ўпэўнены, што да нас прыйшлі самыя лепшыя, актыўныя і матываваныя абітурыенты, а мы, у сваю чаргу, дапаможам ім дасягнуць самых высокіх вяршынь.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ПМК № 187»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Багор пожарный, инв. № 909; огнетушитель ОП-3, инв. № 1473; огнетушитель ОП-4, инв. № 2239; багор пожарный, инв. № 1184; багор пожарный (2 шт.), инв. № 1185; лом пожарный, инв. № 968; ящик под песок, инв. № 100127829; щит пожарный зак. нав., инв. № 926. | 90,38 | 9,04 | 4,52 |
| 2 | 8ПБ 13-1 (15 шт.), инв. № 1334; 8ПБ 16-1, инв. № 100127044; 8ПБ 19-3 (2 шт.), инв. 100127074; 9ПБ13-37 (7 шт.), инв. № 1067 | 55,10 | 5,51 | 2,76 |
| 3 | Рукав 32х43-1,6 (10 п. м), инв. № 100131851; рукав 38х55-3,92 ТУ 38 (60 п. м), инв. 100131856 | 495,60 | 49,56 | 24,78 |
| 4 | Провод ПНСВ 1*1,2 (330 м.), инв. № 8880; прожектор РО-250 (4 шт.), инв. № 8364; прожектор AYIA 250W (3 шт.), инв. № 100126995; эл. вентилятор (2 шт.), инв. № 100128625 | 368,34 | 36,83 | 18,42 |
| 5 | Строп 4СК-5,0/5000, инв. № 100126359; строп 4СК-5,0/5250, инв. № 1501; стропа 2СК-5,0/5250, инв. № 5792; ящик каменщика ЯР-1,000 (2 шт.), инв. № 100126451 | 391,44 | 39,14 | 19,57 |
| 6 | Жалюзи (директор) 6,5 кв. м, инв. № 7723; ковер 3*4 (директор), инв. № 7721; печь микроволновая «Горизонт», инв. № 8070; стул ISO BLACK 19 С-38 (2 шт.), инв. № 7667; стул «Гольф», инв. 77563; стол П232.41, инв. № 77562 | 223,23 | 22,32 | 11,16 |
| 7 | ВБ 2-28Н лев., инв. № 8775; ворота металлические, инв. № 100132829; ДВ1ДЧ 23 21-10, инв. № 857; КСф 10-9, инв. № 1649; КСф 15,6, инв. № 100131381; ПН 20 м, инв. № 1226; профиль прозрачный по 2,1 м (30 шт.), инв. № 100128947; щиты из досок (8 шт.), инв. № 100132605; щиты из фанеры (6,967кв. м), инв. № 100130405; печь дровяная, инв. № 7056 | 418,85 | 41,89 | 20,94 |
| 8 | Беседка для курения 1595914 (1. Шифер 3 стандартных листа; 2. Отлив металлический (мягкий) 2,8 м; 3. Доски (2,8 м – 3 шт., 1,15 м – 7 шт., 1,2 м – 4 шт., 2,2 м – 2 шт.); 4. Брусы 2,8 м – 2 шт.; 5. Щиты (прямоугольные 1,4х1,05 – 2 шт., треуголные 1х0,35 – 2 шт., 1,05х0,85 – 2 шт.), инв. № 6294 | 52,92 | 5,29 | 2,65 |
| 9 | Строп ГУИЛ 484144.010-03,15 (2 шт.), инв. № 100128237 | 36,96 | 3,70 | 1,85 |
| 10 | Шкаф ЩР 11-8-4 (1 шт.), инв. 100129045 | 495,60 | 49,56 | 24,78 |
| 11 | Экскаватор ЕК-14-20, 2009 г. в., двигатель Д-245, дизель, мкпп, з. н. 3996, цвет желтый, пробег 3,6 тыс. км | 14736,00 | 1473,60 | 736,80 |
| 12 | 1. Системный блок AMD 1,93 Ггц ОЗУ 512 Мб HDD 512 Гб DVD; 2. Системный блок AMD Athlon 2 2,7 Ггц ОЗУ 1 Гб HDD 80 Гб DVD; 3. Системный блок Pentium Dual 2,5 Ггц ОЗУ 2 Гб HDD 150 Гб DVD; 4. Системный блок Pentium Dual 2,5 Ггц ОЗУ 1,93 Гб HDD 320 Гб CD R; 5. Системный блок AMD Athlon 2 2,7 Ггц ОЗУ 1 Гб HDD 250 Гб, DVD; 6. Монитор FLATRON L1718S-SN; 7. Монитор FLATRON L1719S; 8. Монитор FLATRON L1742S; 9. Монитор FLATRON L1750U; 10. Монитор FLATRON L1751SQ; 11. Монитор FLATRON L1750SQ; 12. Принтер XEROX PHASER 3117; 13. Принтер XEROX PHASER 3117; 14. Принтер XEROX PHASER 3117; 15. Принтер SAMSUNG ML2010PR; 16. Принтер XEROX PHASER 3122 | 444,74 | 44,47 | 22,24 |
| 13 | 1. Мини АТС, aria soho Digital Hybrid PABXforZOHO; 2. Набор мебели «Виктория Люкс 5»; 3. Устройство термопереплета UNIBIND XU 138; 4. Факсимильный аппарат Panasonic KX-FT 982RU; 5. Антенна СА-600, цифровой спутниковый ресивер GS 7300 | 328,80 | 32,88 | 16,44 |
| 14 | 1. Подмости инвен. шарн.-панельн. ПШ-000 А (с настилом); 2. Сейф металлический; 3. Шкаф металлический для документов; 4. Шкаф металлический для одежды; 5. Бетоносмеситель, BWE 250K; 6. Бункер БП – 1,0 | 1345,30 | 134,53 | 67,26 |
| 15 | Отделочная станция 2М359 | 1865,76 | 186,58 | 93,29 |
| 16 | Станок ПРО-10 (правильно-отрезной станок) | 780,40 | 78,04 | 39,02 |
| 17 | Установка пускозарядная ENERGY1000 START 230-400 | 473,64 | 47,36 | 23,68 |
| 18 | 1. Захват 6 м; 2. Захват ГУИЛ.484135.009-001 | 1312,00 | 131,20 | 65,60 |
| 19 | Пресс гидравлич. напольн. 15 т OMA мод. 660, инв. № 12081 | 720,00 | 72,00 | 36,00 |

В отношении лотов №№ 1–10 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 30 %.** Ранее объявление размещалось в газете «Звязда» № 98 (29978) от 25.05.2023, стр. 10, № 131 (30011) от 11.07.2023, стр. 4, № 150 (30030) от 05.08.2023, стр. 10.
В отношении лотов №№ 11–18 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 60 %.** Ранее объявление размещалось в газете «Звязда» № 55 (29935) от 23.03.2023, стр. 11, № 87 (29967) от 10.05.2023, стр. 6, № 98 (29978) от 25.05.2023, стр. 10, № 112 (29992) от 14.06.2023, стр. 15, № 131 (30011) от 11.07.2023, стр. 4, № 150 (30030) от 05.08.2023, стр. 10. В отношении лота № 19 проводятся первые торги

**Местонахождение лотов №№ 1–19:** Минская область, г. Молодечно, ул. Т. Дудко, д. 10

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | В отношении лотов №№ 1–18: **4 сентября 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)**<br>В отношении лота № 19: **22 сентября 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)**<br>по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | В отношении лотов №№ 1–18: с 10.00 22 августа 2023 года до 16.00 31 августа 2023 года<br>В отношении лота № 19: с 10.00 22 августа 2023 года до 16.00 20 сентября 2023 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901, Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «ПМК № 187», проводимых __.__.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **Сергей Владимирович, тел. +375296109357.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Передвижная механизированная колонна № 187», в лице ликвидатора – ООО «КАНО», тел.: 80173958917; +375293928906 (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 10)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127:<br>☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка»,<br>г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф.4б.<br>www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ЧПУП «ПРОМАГРОМАШ»,<br>Минская область, г. Смолевичи,<br>ул. Грушевская, д. 25 |

**Лот № 1 – комплекс недвижимого имущества, расположенного по адресу: Минская обл., г. Смолевичи, ул. Грушевская, д. 25**

**Здание главного производственного корпуса** (здание специализированное для металлургического производства и (или) металлообработки), инв. № 614/С-35788, общ. пл. 3785,4 кв. м, составные части и принадлежности: пристройка (лит.1), забор (лит. а).
**Цех по производству ПИ-труб и ПИ-фасонных изделий** (здание нежилое), инв. № 614/С-14122, общ. пл. 695,7 кв. м, составные части и принадлежности: пристройка (лит. И1/м), навес (лит. 1).
**Цех по производству ПИ-фасонных изделий** (здание нежилое), инв. № 614/С-33849, общ. пл. 487,8 кв. м.
**Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. № 614/С-14123, общ. пл. 808 кв. м.
**Административное здание** (здание административно-хозяйственное), инв. № 614/С-14121, общ. пл. 389,4 кв. м, составные части и принадлежности: четыре пристройки, три крыльца, навес.
**Земельный участок** общ. пл. 3,3701 га предоставлен продавцу для строительства и обслуживания производственной базы на праве аренды до 05.06.2093.

**Начальная цена* (с НДС 20 %) – 1 674 000 евро**

| № лота | Наименование, модель | Начальная цена* с НДС 20 %, евро |
|---|---|---|
| 2 | **Лазерный станок** Yawei-cKy CFFP-4000-6015 D, 2020 г. в., Китай | **113 400** |
| 3 | **Гидравлический листогибочный пресс** с ЧПУ PBA 6200 на 220 8S в комплекте, 2020 г. в., Китай | **108 000** |
| 4 | **Окрасочно-сушильная камера SPRAY BOOTH PRIMA,** 2021 г. в. | **21 600** |
| 5 | **Гидравлические гильотинные ножницы** YAWEI HGSK 3050 13mm в комплекте | **64 800** |

Шаг аукциона: 5 % от текущей цены по всем лотам.
*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в евро по курсу НБРБ на дату проведения аукциона

**Задаток по лоту № 1 – 0,5 %, по лотам №№ 2–5 – 1 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **2 %** от цены продажи по лоту № 1, **4 %** от цены продажи по лотам № 2, № 3 и № 5, **6 %** от цены продажи по лоту № 4 в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущих торгов опубликовано в газете «Рэспубліка» от 14.07.2023 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **С 11.00 до 13.00 05.09.2023 г.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **04.09.2023 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37;<br>+375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06.<br>E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Станок строгальный четырехсторонний Profimat 23E (WEINIG), инв. № 44502024 | 64 200,00 | 6 420,00 | 3 210,00 |
| 2 | Стреппинг-машина ТР-6000-1, инв. № 4016004 | 10 440,00 | 1 044,00 | 522,00 |

В отношении лотов №№ 1, 2 проводятся первые торги

**Местонахождение лотов:** Минская обл., г. п. Плещеницы, ул. Чапаева, 40

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **22 сентября 2023 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 22 августа 2023 года до 16.00 20 сентября 2023 года** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ООО «Профитсистем», проводимых 22.09.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 14 (четырнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375292751275, Виноградов Дмитрий Алексеевич (понедельник–пятница с 9.00 по 17.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Профитсистем», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375173958917 (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127:<br>☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

Відавочца Перамогі

*Сумесны праект «Звязды» з Магілёўскай абласной арганізацыяй ветэранаў*

# НАПЕРАКОР СМЕРЦІ РАТАВАЛА ЖЫЦЦІ

## Медсястра Ганна Крываспіцкая першай прыходзіла на дапамогу раненым на перадавой чырвонаармейцам

**31 жніўня Ганна Мікалаеўна адзначыць сваё стагоддзе. Яна здзіўляецца, як гэта ёй атрымалася дажыць да такіх паважаных гадоў. Бо нават цяжка падлічыць, колькі разоў за час вайны смерць дыхала ёй у твар. Яна, тады зусім яшчэ юнае дзяўчо, аказалася мацнейшай. «Мне не было часу думаць пра смерць, я ратавала жыцці», — кажа баявая медыцынская сястра. І сэрца замірае ад яе ваенных успамінаў. Ніякія словы не здольны перадаць увесь жах рэчаіснасці, у якую трапіла тады яшчэ 18-гадовая дзяўчына.**



Фота аўтара.

### З першага класа «ляцела на самалёце»

Гэта азначае, што Ганна Крываспіцкая (да замужжа — Абрамовіч) скончыла да вайны школу на выдатна — у яе атэстаце за сем класаў былі адны пяцёркі па пяцібальнай сістэме. Прычым тут самалёт? У іх школе ў вёсцы Антонаўка Чавускага раёна ў фае відэў вялікі стэнд, дзе былі намаляваны самалёт, машына, калёсы і чарапаха. Самалёт сімвалізаваў адзнаку «выдатна», а ўсе астатнія карцінкі, адпаведна, — на бал ніжэй. Да сямігодкі дзяўчынка паспела скончыць пачатковую польскую школу, якая была да вайны ў яе роднай вёсачцы Лапені. У 11 гадоў яна добра ведала польскую мову і магла з лёгкасцю з яе перакладаць. У 1945-м, калі працавала ў польскім шпіталі, ёй гэтыя веды спатрэбіліся.

З дзяцінства засталіся цёплыя ўспаміны пра бацьку. Ён, дарэчы, падчас рэвалюцыі служыў у Петраградзе на «Аўроры», а ў Лапені вярнуўся ў пачатку 1920-х. Хутка і нявесту там падшукаў — Марыю, прычым з заможнай сям'і. Сам быў сірата, але скарыў бацьку дзяўчыны тым, што быў працавіты. І хаця дочкам у спадчыну зямля не выдавалася, цесць выдзеліў маладым невялічкую палосачку, а да яе — кароўку і коніка.

— Ураджай спачатку быў кепскі, але бацька ўсю зіму вазіў на гэтую палоску курыны памёт, купляў у яўрэяў на чыгуначнай станцыі Хватаўка, — расказвае суразмоўніца. — І так добра ўгнаіў зямлю, што ўраджаю стала хапаць да наступнага года. Але настаў час калектывізацыі, бацька адмовіўся ісці ў калгас, і пачаліся праблемы. Яго і яшчэ аднаго маладога мужчыну, які таксама не ўступіў у калгас, арыштавалі і павезлі ў турму ў Магілёў. Жонка наведвала яго, і ён вельмі прасіў, каб прывезлі Ганначку пабачыцца. І яго брат рызыкнуў. Зіма, мароз, дзяўчынка замерзла так, што ні рук, ні ног не адчувала. Калі ўбачыла бацьку, кінулася яму насустрач. Ён расхінуў рукі і падхапіў яе.

— Гляджу ў яго твар і не пазнаю — ён увесь сіні ад пабояў, — расказвае суразмоўніца. — Пытаюся: «Татачка, што з табой?» А ён толькі паўтарае: не хвалюйся, Ганначка, усё добра. Хутка пасля гэтага яго расстралялі без суда і следства па рашэнні «тройкі». Тры чалавекі падпісаліся, што бацька супраць савецкай улады, і абаралі яго жыццё...

Сям'ю раскулачылі і саслалі ў Сібір. Ганна з маці, сястрычкай і брацікам, якому і года не было, трапілі на Валагодчыну. Зіму так-сяк перажылі, а вясной з-за дрэннай вады ў іх пасяленні сталі паміраць дзеці. У выніку было дазволена дзяцей вяртаць на радзіму, калі там яшчэ хтосьці з радні застаўся.

— Па нас прыехаў брат маці, прывёз у вёску і пакінуў каля плота — яго жонка адмовілася нас усіх трох забіраць, — успамінае Ганна Мікалаеўна. — У выніку брат бацькі забраў майго малога брата, а яго сястра, якая жыла ў Ленінградзе, — сястрычку. Я засталася жыць у брата маці. Праз 4 гады вярнуліся з ссылкі дзядуля з бабуляй. Ім як раскулачаным не далі зямлі, але дзед Павел быў добры цясляр і забяспечваў сям'ю ўсім неабходным. Яны нас з братам забралі да сябе, а вось сястра так і засталася ў Ленінградзе.

Пазней яшчэ адна цётка з Ленінграда падшукала Ганне двухгадовыя медыцынскія курсы ў Чавусах. Яна і гэтыя курсы скончыла на выдатна. Хірург, які ў іх выкладаў, пацікавіўся, куды здольная навучэнка збіраецца далей паступаць. І вельмі здзівіўся, калі яна адказала: нікуды. Для вучобы былі патрэбны сродкі, а ў яе ні грошай, ні бацькоў, якія б маглі дапамагчы. І ён паабяцаў прыстроіць Ганну ў інстытут і дапамагаць грашыма, пакуль яна не пойдзе працаваць. Але вайна разбурыла ўсе планы.

### Лятучка на рэйках

Медыцынскія курсы Ганна Мікалаеўна скончыла ў ліпені 1941 года. Лічы, адначасова атрымала пасведчанне і павестку.

— У ваенкамаце мяне паставілі на ўлік і адправілі дадому збірацца, — успамінае яна. — Я апранула свой святочны чырвоны сарафан і белыя парусінавыя тапачкі. Пайшла як на свята, а трапіла на фронт.

Вайна імкліва набліжалася да Чавус, і раненыя з перадавой у шпіталь паступалі сотнямі. Ганне далі загад суправаджаць машыну з ранёнымі на чыгуначны вакзал. Паведамілі, што прыбыў цягнік-лятучка і трэба спяшацца. Па дарозе пачалася бамбёжка. Людзі пабеглі хавацца, а следам за імі і вадзіцель, які вёз Ганну з раненымі. Дзяўчына засталася ў машыне і толькі маліла Бога, каб злітаваўся з іх. Калі варожы самалёт знік, усе сталі вяртацца, у тым ліку і вадзіцель. Даехалі да вакзала, а там мітусня, крыкі, лаянка. Раненых столькі, што не пералічыць. І іх усё падвозяць і падвозяць. Ваенны ўрач бегае ўздоўж цягніка і крычыць, каб хутчэй грузілі.

— Унутры нічога не было — адны сцены, — дзеліцца ўражаннямі ад убачанага Ганна Мікалеўна. — Вагоны нямытыя, брудныя. Раненых складвалі як бярвенні, так шчыльна, што не было дзе нагі паставіць. Ляжаць, небаракі, і толькі стогнуць: піць, піць, піць. Цягнік ужо павінен быў адпраўляцца, і я збіралася вярнуцца да машыны, але начальнік прыпыніў: «Куды? А хто за імі глядзець будзе?» Я і паехала. Раненыя піць просяць, а ў мяне ні сумкі, ні бінтоў, ні вады. Толькі на наступнай станцыі падалі ваду.

Меней чым 50 кіламетраў ад Чавус да Крычава лятучка пераадольвала некалькі гадзін. Увесь час цягніку пагражалі нямецкія самалёты. Ён то прыпыняўся, то рухаўся на хуткасці, каб не трапіць пад бомбы. Калі прыехалі ў Крычаў, там была не меншая сумятня, чым у Чавусах. На лятучцы папоўнілі запасы хлеба і вады і раніцай накіраваліся ў Бранск. Там цэлую ноч разгружалі раненых і цягалі іх да прыстасаванага пад шпіталь будынка праз лес. Ганна, як магла, дапамагала. Пакуль цягнік разгрузілі, ад яе парусінавага абутку нічога не засталося, а чырвоны сарафан ператварыўся ў лахмоцце. Тамтэйшая медсястра пашкадавала дзяўчыну і пагрэла яе ў сваім шынялі. А раніцай Ганне выдалі гімнасцёрку на выраст, боты 42 памеру, шынель. Усё не яе памеру, але ж цяпер яна была апранутая.

### Бомба ўзарвалася за некалькі крокаў

У 1942-м у Мічурынску Тамбоўскай вобласці ваенна-санітарны цягнік, на якім ратавала раненых Ганна Мікалаеўна, разбамбілі ўшчэнт.

— Гэта была страшная масіраваная бамбёжка, — успамінае ваенная медсястра. — Узрывы, крыкі, агонь — сапраўднае пекла. На станцыі пачалі ўзрывацца бочкі з палівам, зямля, здавалася, падымалася да неба, паветра дыхала агнём. Жах быў такі, што словамі не перадаць. Бегла, не ведаючы куды і навошта. Быццам бы нейкая сіла штурхала ў плечы.



Раптоўна пачула: сястра, лажыся. Яна кінулася на зямлю, а голас камандаваў: паўзі, хутчэй паўзі. Ганна рабіла ўсё, што казаў незнаёмец. Калі ён загадаў падаць руку, працягнула і ... страціла прытомнасць.

— Калі прачнулася, не зразумела, дзе я, — кажа жанчына. — Вакол — абгарэлыя дрэвы, цішыня, толькі шэры дым сцелецца па зямлі. Усюды ляжаць раненыя і забітыя. Захацела ўстаць, а на мне мёртвы салдат, увесь кулямі пасечаны. Я адразу ж зразумела, што гэта ён загадваў мне лажыцца і паўзці. Мяне закрыў ад куль, а сам загінуў. Ужо ў шпіталі сказалі, што я нарадзілася ў кашулі. Наш цягнік згарэў датла. Разам з раненымі і маімі калегамі. З усёй медбрыгады ў жывых засталася я адна.

У 1944 годзе немцы разбамбілі яшчэ адзін ваенна-санітарны цягнік, на якім працавала Ганна Мікалаеўна. Здарылася гэта на тэрыторыі Украіны каля сяла Белакаровічы.

— Едзем, а тут немец вылятае, робіць адзін заход, другі, — зноў перажывае трывожныя хвіліны суразмоўніца. — Мы з дзяўчатамі развіталіся, бо было відаць, што фашыст настроены рашуча. З трэцяга заходу ён стаў нас бамбіць. Узрывы прагрымелі ў хвасце цягніка, галаве і пасярэдзіне, дзе я знаходзілася. Бомба ўпала так блізка ад мяне, што шанцаў не было. Выратавала тое, што лягла на падлогу і закрыла галаву рукамі. Узрыў быў страшны. Калі расплюшчыла вочы, убачыла неба. Ад вагона нічога не засталося, а я жывая. Цуд нейкі. На спіне толькі рэмень перасекла. Сама цэлая, але ад магутнага ўзрыву моцна кантузіла. Некалькі месяцаў была як глухая.

Немцы не абмяжоўваліся бомбамі — людзей, якія спрабавалі выратавацца, расстрэльвалі з кулямёта. З аднаго боку быў высокі насып, з другога — балота — схавацца недзе. Нехта ад кулі загінуў, нехта патануў у балоце. Раніцай тых, хто ацалеў, падабралі чырвонаармейцы. Са ста чалавек медперсаналу, які быў на той лятучцы, пасля бамбёжкі засталося 13...

### Ваенны раман

Неяк сяброўка паведаміла: «Ганначка, прывезлі раненага, вельмі цяжкі, але прыгажун. Я з ходу ў яго закахалася. І што мне цяпер рабіць?» Ганна яе толькі суцешыла: «Тонечка, табе ўсе карты ў рукі. Будзеш яго лячыць, застанецца жывы, бліжэй пазнаёмішся». Але так атрымалася, што менавіта гэты паранены стаў лёсам для медсястры з Чавус. Толькі гэта было потым. А тады Аляксандр застаўся ў шпіталі, а Ганна з'ехала на сваёй лятучцы далей.

Потым яны сустрэліся ў Польшчы, дзе яна працавала ў шпіталі. Дзяўчына добра ведала польскую мову і была запатрабавана яшчэ і як перакладчыца. Яна адразу ж пазнала Аляксандра, калі аднойчы раніцай убачыла яго з кіёчкам. І як толькі ён яе адшукаў? Сказаў, што яму пасля ранення далі 10 дзён водпуску і ён едзе дамоў. Але хацеў яшчэ раз пабачыцца перад ад'ездам. Дзяўчына пажадала яму добрага шляху і папрасіла перадаць прывітанне любым беларускім бярозкам. А праз 10 дзён ён вярнуўся далечваца. Папрасіўся менавіта ў той шпіталь, дзе яна працавала. Вайна ўжо заканчвалася, але Ганну дадому не адпускалі. Прыйшлося затрымацца на год. І Аляксандр застаўся яе чакаць. Разам пражылі ў Чавусах больш за 30 гадоў, вырасцілі дачку і сына. Ваенныя гады не прайшлі бясследна, мужны салдат пайшоў з жыцця ў канцы 70-х. Ганна Мікалаеўна засталася вернай сваёй прафесіі і пасля вайны. Паўстагоддзя адпрацавала ў інфекцыйным аддзяленні Чавускай райбальніцы. Дзень Перамогі застаецца для яе самым галоўным святам, хоць без слёз не абыходзіцца.

— У 1945-м Перамогу сустрэла ў Берліне, — расказвае яна. — Наш шпіталь знаходзіўся на паўночна-ўсходняй яго ўскраіне. Калі Германія аб'явіла капітуляцыю і стала вядома, што мы перамаглі, што тут пачалося! Усе крычаць: «Ура! Перамога», страляюць у паветра, радуюцца. Мы з сяброўкай таксама пабеглі распісацца на рэйхстагу. На сцяне не было свабоднага месца, але мы нешта надрапалі. Ідзём назад вясёлыя, радасныя і раптоўна — бац — і маёй баявой сяброўкі няма. Адкуль вылецела тая куля, невядома. Цяжка было страціць сяброўку, і асабліва ў такую хвіліну. Такім запомнілася мне гэта свята — з болем у сэрцы. Самой страляць на вайне не прыходзілася. Ведала толькі перавязкі, у мяне ўсе чатыры ваенныя гады рукі былі ў крыві. Няма калі было страляць — трэба было ратаваць...

Ганна Мікалаеўна замаўкае, а потым просіць дачку Аляксандру, якая сядзіць побач, падпець ёй яе любімую франтавую песню пра медсястру Анюту.

*...Нашу встречу*
*и тот зимний вечер*
*не забыть ни за что,*
*никогда.*
*Дул холодный,*
*порывистый ветер,*
*Замерзала во фляге вода.*
*Был я ранен,*
*и капля за каплей,*
*кровь горячая стыла*
*в снегу.*
*Наши близко,*
*но силы иссякли*
*и не страшен я*
*больше врагу...*

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
*г. Чавусы.*

**P. S.**

Самае каштоўнае, што захавалася ў сям'і Ганны Крываспіцкай, гэта ваенныя фотаздымкі і ўзнагароды. Сярод іх — ордэн Славы III ступені Аляксандра Крываспіцкага, які ён атрымаў за подзвіг пры наступленні. Менавіта тады ён быў цяжка паранены і трапіў у шпіталь. Баявы шлях ваеннай медыцынскай сястры Ганны Крываспіцкай, тады яшчэ Абрамовіч, адзначаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Польшчы», «За Перамогу над Германіяй».

# СПОРТ, ДРАЙВ, ЭМОЦЫІ

## Усё гэта зведалі ўдзельнікі спартыўна-культурнага фестывалю «Вытокі. Крок да Алімпу» ў Касцюковічах

**Нягледзячы на 30-градусную спёку, двухдзённы фестываль прайшоў масава, весела і насычана. Народ актыўна ўдзельнічаў у спартыўных мерапрыемствах, наведваў культурна-забаўляльныя і гандлёвыя пляцоўкі, частаваўся шашлыкамі. І гэта ўсё на фоне гучнай бадзёрай музыкі, народных спеваў і паказаў мод.**





Асноўнай арэнай свята стала пляцоўка каля Касцюковіцкага фізкультурна-аздараўленчага цэнтра (ФАЦ), які быў пабудаваны ў 2017 годзе. Тады жыхары адначасова атрымалі ў падарунак басейн, спартыўную і дзве трэнажорныя залы, а таксама залы барацьбы і бокса. Потым на тэрыторыі ФАЦ за кошт спонсарскіх сродкаў, ахвяраванняў працоўных калектываў і грашовых паступленняў ад суботнікаў былі пабудаваныя тэнісны корт, пляцоўка для пляжнага валейбола, хакейная каробка стандартнага еўрапейскага ўзору 60 на 30 метраў. Выдатна ўжо тым, што ўсё знаходзіцца ў адным месцы. Ды яшчэ ў такім цудоўным! Побач урочышча Баравец, дзе ёсць сцежка здароўя і дзе людзі летам займаюцца скандынаўскай хадзьбой і бегам, зімой катаюцца на лыжах. Адным словам, Касцюковічы — горад спартыўны, і гэта бачна няўзброеным вокам. «Вытокі» арганічна ўпісаліся ў яго.

— Цудоўны фестываль, — не хавае сваіх эмоцый **дырэктар ФАЦ Міхаіл СВІСТУНОЎ**. — Вельмі ганарова, што Касцюковічы сталі ў нашай вобласці трэцім горадам пасля Бабруйска і Горак, дзе ён пабываў. Фестываль дае стымул займацца спортам і дзецям, і дарослым. Добрая магчымасць адначасова наведаць шмат спартыўных пляцовак, пашукаць свой від спорту ды яшчэ атрымаць прыз.

У тым, што ў горадзе створаны добрыя ўмовы для заняткаў спортам, арганізатары свята пераканаліся, наведаўшы Дзіцяча-юнацкую спартыўную школу. І статысячны сертыфікат, які ўручыў падчас адкрыцця свята **Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктар ЛУКАШЭНКА**, дакладна яшчэ больш умацуе спартыўную базу раёна. Віктар Лукашэнка заклікаў і дзяцей, і дарослых яшчэ мацней пасябраваць са спортам і кожнаму выбраць тое, што яму блізкае.

Адразу ж пасля адкрыцця фестывалю дзяцей да 14 гадоў запрасілі праверыць свае магчымасці ў алімпійскім квэсце — розных відах спорту. На больш чым 30 пляцоўках былі арганізаваныя актыўнасці па барацьбе, боксе, біятлоне, веласпорце, валейболе, баскетболе, лёгкай атлетыцы, кулявой стральбе, цяжкой атлетыцы, настольным тэнісе, конным спорце, каратэ, хакеі з шайбай, стральбе з лука, тэнісе, гандболе, міні-гольфе, брэйк-дансе і іншых. За ўдзел і выкананне задання ўручаліся каштоўныя прызы.

Захар Васюкоў прыехаў на свята разам з маці Алесяй з Магілёва. Хлопчык вельмі любіць спорт і як пацвярджэнне прадэманстраваў карту ўдзельніка з адзнакамі, што ён выпрабаваў сябе ў 14 відах спорту. Яго маці расказала, што яны з Захарам бралі ўдзел ва ўсіх фестывалях «Вытокі», якія адбыліся ў Магілёўскай вобласці. Летась у Горках выйгралі блютуз-калонку. Цяпер вось змагаліся за бесправадныя навушнікі. Алеся, дарэчы, таксама са спортам на «ты», яна прадстаўніца Магілёўскай спартыўнай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву «Багіма». І, што асабліва прыемна, наша падпісчыца.



Член Саюза майстроў Рэспублікі Беларусь па ручным ткацтве Валянціна ВОЛКАВА — прыхільніца «Звязды».

На свята жыхары горада прыйшлі разам з дзецьмі. Некаторыя разам беглі ў алімпійскім забегу для дзяцей да дзевяці гадоў. У ім узяло ўдзел каля 500 хлопчыкаў і дзяўчынак. Арганізатары ацанілі волю малых да перамогі. Нехта ў азарце страціў красовак, але з дыстанцыі не сышоў.

Маладая сям'я ў складзе Уладзіміра і Вольгі Прыходзькаў разам з маленькімі сынамі Раманам і Аляксандрам хварэлі за сямігадовую дачку і сястрычку Дашу, якая захацела выпрабаваць сябе ў кросе.



Уладзімір і Вольга ПРЫХОДЗЬКІ разам з сынамі Раманам і Аляксандрам.

Крэатыўна падышоў да справы «Белаграпрамбанк». На яго пляцоўцы можна было згуляць у жартоўныя віды спорту, напрыклад, перавернуты футбол, дзе гуляць трэба ў акулярах віртуальнай рэальнасці, або хэдбол, дзе, каб забіць гол, трэба дзьмуць. За ўдзел у кожнай гульні таксама ўручаўся падарунак.

Вельмі яркі атрымаўся і культурны складнік. Многія раёны Магілёўскай вобласці прадставілі свае адметнасці. Краснаполле прыехала з глечыкамі і артыстамі праслаўленага народнага тэатра, Мсціслаў — са сваімі каванымі вырабамі і рыцарамі, Хоцімск — з народнымі майстрамі і лялькамі-абярэгамі, Клімавічы — са знакамітым аграрным каледжам і кантактным міні-заапаркам: трусяня, казляня і кацяня. Установа, дарэчы, рыхтуе ветэрынараў і кіроўцаў. На свята Клімавіцкі каледж прыхапіў яшчэ і спецыяльны трэнажор, дзе можна віртуальна пракаціцца на аўтамабілі. Самі Касцюковічы прадэманстравалі ткацкія дасягненні. **Член Саюза майстроў Рэспублікі Беларусь па ручным ткацтве Валянціна ВОЛКАВА** скарысталася магчымасцю перадаць прывітанне паважанаму калектыву «Звязды» і асобнае — Анатолю Клешчуку. Што датычыцца «Вытокаў», то яна лічыць, што спорт і культура непарыўна звязаныя.

— Нават седзячы за станком, калі ты не зробіш размінку, будзе застой крыві, — смяецца майстар. — А без гэтага няма ўжо той актыўнасці і пазітыўнасці. Свята вельмі шырокага спектра і маштабу. Мы на ім і ў Бабруйску, і ў Горках прысутнічалі.

Сваю нішу тут знайшлі і спевакі, і дызайнеры, і мастакі. Мастацкая галерэя-салон «АртХаос» з Мінска арганізавала на фестывалі інтэрактыў «Гуляйце з намі — малюйце самі». Яе **дырэктар Лілія ЛУКАШЭНКА** адзначыла, што фестываль «Вытокі» перш за ўсё — аб'яднальнае свята і, што вельмі важна, сямейнае. Тут знаходзяць цікавае для сябе людзі рознага ўзросту.

— Для станаўлення ўсебакова развітой асобы трэба паспрабаваць сябе ва ўсім, і фестываль дае такую магчымасць, — адзначыла яна. — У Касцюковічах мастацкі складнік і інтэрактыў, перш за ўсё, былі разлічаныя на дзяцей. Юныя мастакі атрымалі магчымасць узяць пэндзаль у рукі і аздобіць горад, стварыўшы прыгожую пляцоўку. Кожны рэгіён унікальны, мае сваю гісторыю, таленавітых людзей. Мы выступаем за захаванне традыцый.

— На мой погляд, склалася ўнікальная формула свята, якая ўключае ў сябе і культуру, і традыцыі, і самабытнасць, і ўзнімае гісторыю таго месца, дзе яно праводзіцца, — падзяліўся меркаваннем з карэспандэнтам «Звязды» **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА**. — І, вядома ж, гэта тыя квэсты, спартыўныя пляцоўкі, якія працуюць падчас фестывалю. Свята каштоўнае тым, што не мае меж, пастаянна пашыраецца. А падарунак ад арганізатараў у выглядзе 100-тысячнага сертыфіката толькі дапаможа развіццю мясцовых відаў спорту. Вельмі прыемны бонус да мерапрыемства.

Дарэчы, што датычыцца бонусу, то ён сапраўды патрэбны раёну для ўмацавання спартыўнай базы.

— Плануем абнавіць спартінвентар, — падзялілася **старшыня Касцюковіцкага райвыканкама Аляксандра МІХЕЕНКА**. — Нам неабходны аўтобус для дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы, каб дзеці актыўна ўдзельнічалі ў спартыўных мерапрыемствах.



Як трапна выказалася падчас адкрыцця фестывалю Аляксандра Міхеенка, гэтае свята — як працяг Указа Прэзідэнта «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна». «Мы павінны развіваць не толькі эканоміку, але і спорт, і культурныя сувязі. І ў нас для гэтага ўсё ёсць», — падкрэсліла яна.

Свята вылучаецца яшчэ і тым, што на ім заўсёды вельмі шмат моладзі. На фестываль у Касцюковічы прыехалі дзеці і падлеткі з 19 раёнаў вобласці, а таксама моладзь Браншчыны з Расіі.

— Гэтае свята пад эгідай Нацыянальнага алімпійскага камітэта стала ўжо брэндам нашай краіны, — падкрэсліў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА**. — Усе рэгіёны чакаюць фестываль. Касцюковічы славяцца сваімі традыцыямі і гісторыяй, у той жа час гэта сучасны горад, дзе будуецца шмат спартыўных пляцовак, літаральна ў верасні мы будзем адкрываць тут яшчэ адну — баскетбольную. «Вытокі» — не толькі культурна-спартыўнае мерапрыемства, яно мае і выхаваўчую мэту: прапагандуе дзецям і дарослым здаровы спосаб жыцця. Хочацца, каб гэты фестываль шырыўся і ахопліваў як мага большыя слаі насельніцтва.

Арганізатарамі фестывалю «Вытокі» з'яўляюцца Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь, Федэрацыя прафсаюзаў Рэспублікі Беларусь, ТАА «АртХаос» і ТАА «БелБрэндАўдыт».

Свята ў Касцюковічах закончылася, але 25—26 жніўня яно працягнецца ўжо ў Барысаве.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

# ШЧАСЛІВЫ БІЛЕТ ДЛЯ 555-ГАДОВАГА АСТРАЎЦА

## Як раённае мястэчка ператварылася ў горад атамшчыкаў

**Нягледзячы на больш як пяцісотгадовую гісторыю, Астравец — самы малады ў краіне горад, які атрымаў гэты статус дзякуючы будаўніцтву Беларускай АЭС. Цяпер былы шараговы райцэнтр на Гродзеншчыне вядомы далёка за межамі Беларусі і мае асаблівы твар ды асаблівы рытм жыцця. На выхадных горад атамшчыкаў адзначыў сваё 555-годдзе. Карэспандэнт «Звязды» паўдзельнічала ў святе.**

### «Мы жывём у Астраўцы і мы жывём Астраўцом»

555-гадовая дата — сімвал адзінства розных пакаленняў астраўчан, свята, якое аб'ядноўвае не толькі жыхароў горада, але і тых, хто лічыць яго радзімай сваіх продкаў, хто адчувае повязь, знаходзячыся за сотні і тысячы кіламетраў. Аднак найперш гэта свята людзей, якія тут выраслі і працягваюць сваёй штодзённай працай фарміраваць паспяховую будучыню Астраўца. Юбілей — добрая нагода яшчэ раз успомніць слаўную гісторыю сваёй малой радзімы, усвядоміць сябе патрыётамі і грамадзянамі, адчуць гонар за сваіх землякоў — вялікіх працаўнікоў і мужных абаронцаў айчыны, выказаўся, віншуючы гараджан, **старшыня Астравецкага райвыканкама Ігар ШАЛУДЗІН:**

*— У 2008-м Астравец выцягнуў шчаслівы білет, менавіта наша пляцоўка была вызначана прыярытэтнай для будаўніцтва першай АЭС, што паслужыла прагрэсу не толькі раёна, але і ўсяго рэгіёна. Сёння Астравец — гасцінны, добраўпарадкаваны, сучасны горад, зручны для жыцця, дзе ёсць усе неабходныя ўмовы для камфортнага пражывання і працы. Упэўнены, што ў нашага горада — вялікія перспектывы, а ў яго працавітых і клапатлівых жыхароў — багатыя магчымасці для самарэалізацыі і здзяйснення самых смелых праектаў. Мы жывём у Астраўцы і мы жывём Астраўцом, нашымі агульнымі каранямі, гісторыяй, традыцыямі, і мы іх працягваем.*

Старшыня райвыканкама асобна падзякаваў Дзяржкарпарацыі «Расатам», з дапамогай якой у раёне ажыццяўляецца не толькі самы маштабны інвестпраект у краіне (будаўніцтва БелАЭС), але і здзейснена каля 150 сацыяльных праектаў. Вядома ж, актыўна ўдзельнічала кампанія і ў святкаванні. Ужо пяты год запар тут ладзяць навукова-пазнавальны фестываль «Дзень атамнага горада», дзе сіламі «Расатама», Інфармацыйнага цэнтра па атамнай энергіі і пры садзейнічанні мясцовага райвыканкама сёлета было арганізавана больш за 40 разнастайных актыўнасцей для дарослых і дзяцей. Гэта розныя інтэлектуальныя віктарыны і гульні, фізічныя шоу, «атамныя» эксперыменты і флэшмобы. Агульнымі намаганнямі госці свята збудавалі машыну Голдберга. Дарослыя і дзеці ў захапленні бегалі праз браму, якая распырсквала ваду (што было вельмі дарэчы ў спякотную святочную суботу). А чарга з жадаючых убачыць горад з вышыні, узняўшыся на пад'ёмніку, ды яшчэ і атрымаць крэатыўнае 360-градуснае фота на фоне гарадской панарамы, не меншала да самага вечара.



*— За 11 гадоў будаўніцтва АЭС Астравец стаў для нас родным. Гэта малады і суперсучасны горад, і для нашай кампаніі вялікі гонар быць часткай гісторыі яго развіцця,* — падзяліўся эмоцыямі **Віталь ПАЛЯНІН, дырэктар праекта па стварэнні БелАЭС.**

### Эканамічны і сацыяльны эфекты

Па выніках 2022-га (гэтак сама як і ў 2018-м, 2019-м і 2021-м) Астравецкі раён занесены на Рэспубліканскую дошку гонару за дасягненне высокіх вынікаў у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця. Сэрца Астраўца — яго жыхары: энергічныя, высокаадукаваныя, таленавітыя, якія не толькі самааддана працуюць, але і аддаюць яму частку свайго сэрца, перакананы Ігар Шалудзін, які згадаў, што ў пачатку будаўніцтва АЭС цяперашні райцэнтр быў гарадскім пасёлкам, дзе пражывала восем тысяч чалавек, і меў адзін мікрараён жылой забудовы:

*— Цяпер там, дзе былі палі і ўскраіны, з'явіліся новыя мікрараёны шматпавярховай забудовы з камфартабельнымі кватэрамі. З'явіліся тры новыя мікрараёны (збудавана больш як чатыры тысячы кватэр агульнай плошчай звыш 340 тысяч м²), якія злучаюць праспект Энергетыкаў, насельніцтва павялічылася да 14,8 тысячы чалавек, а да 2025 года, як прагназуецца, тут стане больш за 15,5 тысячы жыхароў. У 2012-м па ўзроўні зарплаты Астравецкі раён займаў 12-е месца ў вобласці, а цяпер па гэтым паказчыку ўваходзім у топ-дзесятку раёнаў краіны, бюджэт раёна стаў бездатацыйным.*



2023-ы, аб'яўлены Годам міру і стваральнай працы, для астраўчан багаты на падарункі. Год пачаўся з адкрыцця рэканструяванай кінаканцэртнай залы «Астравец» на 298 месцаў, дзе з'явілася найноўшае светлавое і лічбавае абсталяванне ў фармаце 2D і 3D. Напярэдадні Дня Перамогі адкрылася новая двухпавярховая лядовая пляцоўка з хакейнай каробкай 30 на 60 метраў, разлічаная на 300 гледачоў.

*— Непасрэдна перад 555-годдзем горад атрымаў пасля рэканструкцыі чатыры корпусы раённай паліклінікі з сучасным абсталяваннем. Гэта шэраг кабінетаў для аказання дыягнастычнай і лячэбнай дапамогі. Мы будзем працягваць будаваць яе. А яшчэ адзін падарунак да свята ў межах праекта «Спорт для ўсіх» — шматфункцыянальная спартыўная пляцоўка, якая стала вельмі запатрабаванай у жыхароў,* — удакладніў старшыня райвыканкама. — *Сёлета пачынаецца будаўніцтва новай школы ў трэцім мікрараёне на 510 месцаў.*

Шмат праектаў з дапамогай «Расатама» рэалізавана ў Беларусі і ў галіне ядзернай медыцыны. Створаны тры рабочыя групы з Міністэрствам аховы здароўя: па пастаўках медабсталявання цяжкага класа; па рэалізацыі буйных інфраструктурных аб'ектаў; па стварэнні інфраструктуры для выкарыстання радыефармпрэпаратаў і па стварэнні інавацыйных радыефармпрэпаратаў (РФП).

*— У ліпені беларускія анколагі наведалі Тульскі анкацэнтр, дзе пагледзелі, як працуе медыцынскі выраб «Брахіум» для кантактнапрамянёвай тэрапіі. Цяпер мы разумеем, у які бок трэба развіваць наш прадукт, і ўжо налета плануюцца пастаўкі ў Беларусь. У напрамку рэалізацыі буйных інфраструктурных аб'ектаў разглядаецца апёкавы цэнтр пры бальніцы хуткай меддапамогі ў Мінску. Праект будзе рэалізоўвацца сумесна з беларускім партнёрам — кампаніяй «Еўрафармінтэграцыя». На фінальнай стадыі сумесная прапанова па распрацоўцы новага РФП у рамках праекта Саюзнай дзяржавы (налета мяркуецца пасля заключэння дзяржкантрактаў выйсці на рэгістрацыйныя выпрабаванні гатовага прэпарату),* — пракаментаваў **Станіслаў ЛЯВІЦКІ, дырэктар краінавага офіса Дзяржкарпарацыі «Расатам» у Беларусі.** — *Рэалізоўваецца таксама праект па ўкараненні сучасных трэнажораў на аб'ектах цеплагенерацыі. Ён дазваляе навучаць персанал, выкарыстоўваючы канцэпт лічбавага двайніка. Падобнымі інавацыйнымі трэнажорамі плануецца аснасціць усе аб'екты энергасістэмы Беларусі.*

Двума энергаблокамі АЭС сёння ўжо выпрацавана больш за 18 млрд кВт·г электраэнергіі, якія дазволілі замясціць каля пяці мільярдаў м³ газу, што прынесла значны эканамічны эфект, а на яго фоне — і сацыяльны, заўважыў **Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі:**

*— Мы зрабілі правільны выбар адносна стратэгічнага партнёра праекта будаўніцтва станцыі — Дзяржкарпарацыі «Расатам» і месца для яе будаўніцтва — Астраўца. Першапачаткова разглядалася 76 пляцовак, і пераможцам выйшаў ваш горад. Згаданы праект, рэалізаваны ў рамках Саюзнай дзяржавы, — самы значны ў межах СНД і, пэўна, у Еўропе. Сёння дзякуючы БелАЭС Астравец ведаюць у любой краіне свету. З уводам другога энергаблока, які знаходзіцца на фінальнай стадыі рэалізацыі, у Беларусі будзе выраблена 18 млрд кВт·г штогод. Гэта дазволіць з часам паступова замяшчаць энергаблокі на традыцыйных відах паліва.*

### Атамны клас, кава з жалудоў, горад на вышыні

Астравец для Гродзенскай вобласці стаў драйверам развіцця. З'явілася АЭС — і ў вобласці, і ў краіне пачалі мадэрнізавацца лініі электраперадачы. Грамадзяне падлічылі, што выгадна ацяпляць жыллё электрычнасцю, а каб граматна і рацыянальна выкарыстоўваць яе, з'яўляюцца разумныя гаджэты. Новыя прадпрыемствы ў суседніх раёнах выкарыстоўваюць электраэнергію АЭС, расказаў **Віктар ПРАНЮК, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама:**

*— На Гродзеншчыне з'явіліся прадпрыемствы, якія сталі выраблядь інавацыйныя абагравальныя элементы. З'явіліся элементы разумнага дома, сталі праграмаваць працэсы, якія паскараюць вытворчасць. У вобласці адкрываюцца інжынерныя класы, і цікавасць вучняў стала прадметнай, бо яны былі ў музеі, бачылі, як уладкавана АЭС, і ім хочацца вывучаць рэальную навуку.*

У рамках праграмы «Атамкласы», якую рэалізоўвае «Расатам», у астравецкай школе № 3 створаны такі клас, дзе школьнікі паглыблена вывучаюць прадметы прыродазнаўча-матэматычнага цыкла, займаюца робататэхнікай і даследчай дзейнасцю.

У Астраўцы з'явіліся сацыяльныя аб'екты, якім могуць пазайздросціць і ў абласных цэнтрах. Напрыклад, шматфункцыянальны комплекс сацыяльна-культурнага прызначэння і для творчасці моладзі, які з'явіўся ў 2021-м. На першым паверсе размясціліся трэнажорная зала, харэаграфічны клас, 3D-кінатэатр, боўлінг і музей. На другім — бібліятэка, кніжны фонд якой амаль 40 тысяч, яна стала месцам правядзення розных афіцыйных і культурных сустрэч. Чытачам, дарэчы, прапануюць брэндавую астравецкую каву з жалудоў. На гэтым жа паверсе глядзельная зала на 300 месцаў і загс. У дзень 555-годдзя тут пабраліся шлюбам шэсць пар. На трэцім паверсе — Цэнтр культуры і народнай творчасці і Цэнтр рамёстваў, дзе працуюць сем майстроў, расказала **Вольга БАЯРОВІЧ, загадчыца сектара культуры Астравецкага райвыканкама:**

*— Пакуль мама ў «трэнажорцы», а бацька ў кіно, дзеці — у бібліятэцы, так што ўсім ёсць дастойны занятак. Да стварэння адзінага комплексу аб'екты былі раскіданы па горадзе, а цяпер яны ўсе ў адным месцы і аснашчаны найноўшым абсталяваннем. У першай зале музея знаходзіцца пастаянная гісторыка-этнаграфічная выстава. У другой — зменныя экспазіцыі: тут мы плануем паказаць праект развіцця Беларусі канца XX — пачатку XXI стагоддзя. Тэматыка трэцяй залы прысвечаная генацыду.*

Новая бальніца — адзін з самых сучасных у краіне медыцынскіх комплексаў, дзе функцыянуюць 18 аддзяленняў, 12 з якіх маюць статус міжраённых. Працуюць два рэсурсных цэнтры: для пацыентаў з вострымі парушэннямі мазгавога кровазвароту і пацыентаў з вострымі інфарктамі. Мясцовы кабінет МРТ мае аналагі толькі ў Гродне і Ваўкавыску. А ПЛР-лабараторыя, падораная некалі бальніцы «Расатамам», вельмі дапамагла ў час пандэміі, кажуць тут.

Для здаровага спосабу жыцця ў горадзе створаны спартыўна-аздараўленчы комплекс «Імпульс», вяровачны гарадок, вулічны скаладром; рэалізавана шмат магчымасцяў для заняткаў як дзяцей, так і тых, каму за 70.

Як сведчыць статыстыка, адна сям'я атамшчыкаў стварае 5-7 дадатковых рабочых месцаў для тутэйшых: у горад падцягваюцца ўрачы, настаўнікі, прадаўцы. Адным словам, у горадзе ёсць усё для камфортнага жыцця, таму сюды пераязджаюць многія спецыялісты, што пацвярджае, у прыватнасці, сям'я, якая сем гадоў таму пераехала ў Астравец жыць (Ганна — з Мінска, Дзмітрый — з Магілёва). Цяпер у іх падрастае трохгадовая дачка Валерыя, так што жыхароў у горадзе атамшчыкаў большае, а сам горад застаецца на вышыні ва ўсіх сэнсах.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**



## БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона**
**ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА**
**методом повышения начальной цены (шаг – 5 %):**

| № объекта* | Характеристика имущества | Местонахождение имущества | Начальная цена |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (назначение: помещение транспортного назначения; наименование: гараж) с инвентарным номером 200/D-192844 общей площадью: 289,7 кв. м | г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83Д-2 | 178 279,79 (сто семьдесят восемь тысяч двести семьдесят девять рублей 79 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 29 713,30 (двадцать девять тысяч семьсот тринадцать рублей 00 копеек) |
| 2 | Капитальное строение (назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства; наименование: водопроводная сеть) с инвентарным номером 200/С-500870 протяженностью 26 м | г. Витебск, пр-т Фрунзе, водопроводная сеть к зданию № 83Д | 8 772,24 (восемь тысяч семьсот семьдесят два рубля 24 копейки), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 1 462,04 руб. (одна тысяча четыреста шестьдесят два рубля 04 копейки) |
| **Всего:** | **187 052,03 (сто восемьдесят семь тысяч пятьдесят два рубля 03 копейки), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 31 175,34 (тридцать одна тысяча сто семьдесят пять рублей 34 копейки)** | | |

**Прим. Объекты недвижимости продаются в составе одного лота.*

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

Заявление на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1 **в срок до 16.00 20.09.2023.**

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота в срок до 12.00 20.09.2023 на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

**Аукцион состоится 22.09.2023 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.**

Особые условия: победителем аукциона либо единственным участником возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ. Дополнительно победитель аукциона либо единственный участник приобретает объекты основных средств по стоимости 1 349,56 руб. (в т. ч. НДС 20 %): контейнер металлический с двумя мет (инв. номер 200990000006674), роллета (ворота секционные СП *3960*) (инв. номер 200990000006667), роллета (ворота секционные СП *3620*) (инв. номер 200990000006666).

Также победителю аукциона либо единственному участнику в течение 1-го месяца со дня передачи Лота № 2 необходимо заключить договор на водоснабжение и водоотведение с водоснабжающей организацией и договор на водоснабжение и водоотведение с ОАО «АСБ Беларусбанк», где Банк будет являться субабонентом, сроком на 3 года с возможностью пролонгации; в течение 3 месяцев со дня передачи Лота № 1 получить технические условия на электроснабжение, разработать проект на электроснабжение, установить прибор учета электроэнергии и произвести устройство внутреннего электроснабжения в объекте (Лот № 1); в течение 1-го месяца провести работы по ограждению забором своей территории

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения.

Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

**Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8 (029) 309-42-19.**

---

УНП 191061436

## ДОПОЛНЕНИЕ к проектной декларации ООО «Датч Стар»,

*опубликованной в газете «Звязда» 01.09.2022 г.,*

**по объекту**

«Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина» (2-я очередь строительства)

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

**5 (пять)** однокомнатных квартир **площадью от 41 до 63 кв. м**, стоимость 1 кв. метра **от 4 128 до 4 600 белорусских рублей;**

**5 (пять)** двухкомнатных квартир **площадью от 67 до 134 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 3 520 до 4 100 белорусских рублей.**

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты объекта строительства.

**Условия оплаты** – полная оплата цены договора в течение 3 – 7 календарных дней с момента регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется по предварительной договоренности в рабочее время ООО «Датч Стар» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1515.

Тел.: 375 (17) 336 73 88, 375 (44) 5343000, 375 (29) 5343000.

---

УНП 191061436

## ИЗМЕНЕНИЯ в проектную декларацию ООО «Датч Стар»,

*опубликованной в газете «Звязда» 03.03.2022 г.,*

**по объекту**

«Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина» (1-я очередь строительства)

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

**3 (три)** однокомнатных квартиры площадью **71-72 кв. м,** стоимость 1 кв. м от **3 840 до 4 300 белорусских рублей;**

**5 (пять)** двухкомнатных квартир площадью **от 79 до 138 кв. м,** стоимость 1 кв. м от **3 776 до 4 300 белорусских рублей.**

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты объекта строительства.

**Условия оплаты** – полная оплата цены договора в течение 3 – 7 календарных дней с момента регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется по предварительной договоренности в рабочее время ООО «Датч Стар» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1515.

Тел. 375 (17) 336 73 88, 375 (44) 5343000, 375 (29) 5343000.

---

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена (без НДС), бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Квартира,** общ. пл. 61,4 кв. м, инвентарный № 500/D-7988203064. Адрес: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-178 | 256 000,00 |
| 2 | **Квартира,** общ. пл. 78,4 кв. м, инвентарный № 500/D-7988203067. Адрес: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-191 | 329 000,00 |
| 3 | **Квартира,** общ. пл. 81,7 кв. м, инвентарный № 500/D-7988203068. Адрес: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-195 | 272 000,00 |
| 4 | **Квартира,** общ. пл. 80,3 кв. м, инвентарный № 500/D-7988203069. Адрес: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-200 | 268 000,00 |
| 5 | **Квартира,** общ. пл. 81,7 кв. м, инвентарный № 500/D-7988203071. Адрес: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-203 | 272 000,00 |
| 6 | **Квартира,** общ. пл. 81,4 кв. м, инвентарный № 500/D-7988203072. Адрес: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-207 | 271 000,00 |
| 7 | **Квартира,** общ. пл. 81,2 кв. м, инвентарный № 500/D-7988203073. Адрес: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-211 | 271 000,00 |
| 8 | **Квартира,** общ. пл. 81,7 кв. м, инвентарный № 500/D-7988203074. Адрес: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-219 | 272 000,00 |
| 9 | **Квартира,** общ. пл. 81,7 кв. м, инвентарный № 500/D-7988203075. Адрес: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-223 | 272 000,00 |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона по всем лотам

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **10 (десять) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи |

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **22.09.2023 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 21.09.2023 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (29) 317-95-42.**
**E-mail: auction@cpo.by**

---

## Извещение о проведении аукциона по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и земельного участка в частную собственность в аг. Вязье Осиповичского района Могилевской области

| № лота | Наименование объекта / адрес участка | Кадастровый номер, вид вещного права | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. документации, проведение оценки (руб.) | Описание не завершенного строительством жилого дома, дачи, его составных частей. Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании | Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом по ул. Молодежной, 2 в аг. Вязье, Осиповичского района Могилевской области | 724880401601000462. Земельный участок в частную собственность | 0,2061 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)) | 9 252,54 руб., в том числе начальная цена не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома – 4 079,43 руб., начальная цена продажи земельного участка в частную собственность – 5 173,11 руб. | 1 800,00 | 141,10 | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом – фундамент бетонный, износ конструктивных элементов – 20 %, площадь застройки 102 м² | Определяется проектной документацией |
| Размер штрафа уплачиваемый в случаях, определенных Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 марта 2018 г. № 220, и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 | | | | | | | | | 3700,00 рублей |

| | |
|---|---|
| **Организатор аукционных торгов – УКПП «Архитектура» Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. Сумченко, 33. Контактные телефоны: +3752235-66101, +375293999800, +375336075847** | Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется Вязьевскому сельскому исполнительному комитету на р/с № BY04AKBB36411165500077100000 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» ЦБУ № 722 BIC AKBBBY2X, УНП 700023291, код 40901. Задаток перечисляется в период подачи заявлений до момента регистрации участника |

**Условия проведения аукциона:** аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 марта 2018 г. № 220, и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь, допускается участие в аукционе консолидированных участников.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона до его начала**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка; гражданином – копия документа, содержащая его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки внесения платы за земельный участок), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Информация о затратах, доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается на расчетный счет, указанный в протоколе о результатах аукциона, либо о признании аукциона несостоявшимся;

• в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обратиться за государственной регистрацией земельного участка, прав на него в Осиповичское бюро Бобруйского филиала республиканского унитарного предприятия «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

• соблюдать права и обязанности землевладельцев, землепользователей и собственников земельных участков, установленные Кодексом Республики Беларусь о земле;

• осуществлять всякое строительство, расширение, реконструкцию строений и сооружений в соответствии с законодательством;

• обеспечить использование земельного участка в соответствии с целевым назначением и условиями его предоставления;

• до занятия земельного участка осуществлять работы по наведению порядка на предоставленном земельном участке и его благоустройству в соответствии с требованиями земельного законодательства;

• осуществить строительство объекта в сроки, определенные законодательством.

**Аукцион состоится 21 сентября 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Осиповичи, ул. Сумченко, 30, каб. № 29.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 21.08.2023 г. до 16.30 19.09.2023 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Осиповичи, ул. Сумченко, 33, каб. 304.**
**Контактные телефоны: (+3752235)66101, +375293999800, +375336075847.**
**Извещение о проведении аукциона опубликовано на сайтах: www gki.gov.by, www.mogilev-region.gov by, www.osipovichi.gov.by**

# «Караткевіч напісаў кінасцэнарый...»: год 1963

**Падыходзіла да завяршэння «эпоха Хрушчова». Многія ілюзіі разбіваліся аб цвёрды і халодны лёд савецкай рэчаіснасці. Але ж жыццё не стаяла на месцы. І ў беларускай літаратуры — таксама.**

**Пра тое, што было зроблена пісьменнікамі за 1963 год, сведчыць папера, адрасаваная Аддзелу навукі і культуры ЦК КПБ. Аўтар — адказны сакратар Праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Мікола Ткачоў. Дакумент, датаваны 6 студзеня 1964 года, захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Ёсць у ім самім пэўная інтрыга...**

Па-першае, чаму так хутка, у самым пачатку года, лічы, адразу пасля навагодніх свят, патрэбна было здаваць гадавую справаздачу?! Па-другое, саюзам на той час кіраваў народны паэт Беларусі Пятрусь Броўка (1905 — 1980). З 1954 да 1980 гг. «на другіх ролях» (а часам — і на самых першых па сутнасці, калі не па пасадзе) знаходзіўся Іван Пятровіч Шамякін (праўда, народным пісьменнікам Беларусі ён стаў крыху пазней — у 1972 годзе)... А вось справаздачу за год у ЦК падпісаў усё ж Мікола Ткачоў (1918 — 1979), празаік, перакладчык, журналіст. Аўтар некалькіх кніг прозы і публіцыстыкі, рамана «Згуртаванне». У 1957 — 1959 гг. — галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва». У 1959 — 1972 гг. — адказны сакратар Праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, у 1972 — 1979 гг. — дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Заўважым, што Мікола Ткачоў — першы дырэктар гэтага выдавецтва... Яшчэ адзін народны, ужо народны, паэт Беларусі Рыгор Барадулін пакінуў у сваіх успамінах такі радок: «... Мікола Ткачоў, а пасля Міхал Дубянецкі годна і руплівa дырэктаравалі ў выдавецтве, стараючыся хоць як вырваца з-пад нядрэмнага кантролю ЦК...»

А ў запісцы ў ЦК адказны сакратар Праўлення СП БССР Мікола Ткачоў з самага пачатку дакладвае наступнае: *«Паведамляем аб праробленай Саюзам пісьменнікаў БССР арганізацыйнай і творчай працы на працягу мінулага, 1963 года. Уся праца за гэты перыяд праводзілася ў святле задач, якія вынікалі з сустрэч кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва і з рашэнняў чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС. Саюзам пісьменнікаў БССР былі праведзены наступныя мерапрыемствы...»*

І далей ідзе пералік — амаль на дзве старонкі... Па пунктах...

*«1. Сход пісьменнікаў па выніках першай сустрэчы дзеячаў культуры з кіраўнікамі партыі і ўрада.*

*2. Сход пісьменнікаў па выніках другой сустрэчы...»*

З вышыні сённяшняга дня, відавочна, трэба хоць бы сёе-тое растлумачыць пра той перыяд. Менш чым за год ад часу напісання ці датавання запіскі, 7 сакавіка 1963 года, у Свярдлоўскай зале Крамля адбылася знакамітая сустрэча кіраўнікоў партыі з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі. Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў выступіў са сваёй даволі жорсткай прамовай. Лічыцца, што кіраўніка партыі і краіны на адпаведную стылістыку справакавала сустрэча Андрэя Вазнясенскага і Васіля Аксёнава, які пазней эмігруе з Савецкага Саюза, з польскімі журналістамі. У час сустрэчы польская журналісты задалі пытанне: «Ці сапраўды адзіны стыль у савецкім мастацтве — сацыялістычны рэалізм?» Адказ быў наступны: «Не адзіны. Ёсць яшчэ...» Публікацыя інтэрв'ю трапіла на вочы легендарнай Вандзе Васілеўскай, якая інтэрпрэтавала прачытанае наступным чынам: «Мікіта Сяргеевіч, у вашай краіне жывуць такія пісьменнікі, якія перашкаджаюць будаваць сацыялізм у Польшчы...» ...Настрой маскоўскіх абмеркаванняў не мог не перадацца і далей, у рэспубліку. Зразумела, і ў Мінск... Напружанасць патрабавала, вядома, і справаздачы...

Далей ідзе наступны пералік мерапрыемстваў, якія б сведчылі, што пісьменнікі, творчы саюз працуюць, «выпраўляюцца»: «...*3. Сход, прысвечаны разгляду творчасці маладых беларускіх пісьменнікаў.*

*4. Сумесны сход драматургаў і тэатральных работнікаў з разглядам надзённых праблем беларускай драматургіі.*

*5. Пасяджэнне Прэзідыума разам з секцыяй паэзіі, на якім абмяркоўваліся першыя зборнікі многіх маладых паэтаў, у тым ліку паэтаў (А. Наўроцкі), якія ў сваёй творчасці дапусцілі памылкі фармалізму.*

*6. Абмеркаванне Прэзідыума сумесна з секцыяй прозы рамана маладога празаіка Ул. Караткевіча «Леаніды не вернуцца да Зямлі» — твора, які моцна крытыкаваўся і які адхілены ад асобнага выдання.*

*7. Сход пісьменнікаў рэспублікі, прысвечаны вынікам чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС і вынікам рэспубліканскай нарады актыву творчай інтэлігенцыі.*

*8. Дзесяцідзённы семінар маладых і пачынаючых літаратараў Беларусі, у час якога была разгледжана творчасць 40 чалавек.*

*9. Месячны семінар кінадраматургаў (20 чалавек), на якім абмяркоўваліся і дапрацоўваліся новыя кінасцэнарыі.*

*10. Разгляд на пашыраным пасяджэнні Прэзідыума работы часопіса «Полымя» за 1963 год. У бліжэйшы час будзе разгледжана і работа іншых літаратурных часопісаў, а таксама газеты «Літаратура і мастацтва».*

*11. Сістэматычны разгляд новых твораў пісьменнікаў на сходах і пасяджэннях усіх творчых секцый.*

*12. Тыдзень літоўскай кнігі ў Беларусі, у час якога адбылося шмат сустрэч пісьменнікаў з працоўнымі рэспублікі.*

*13. Літаратурныя вечары, прысвечаныя творчасці пісьменнікаў-далёкаўсходнікаў (паездкі групы пісьменнікаў з Далёкага Усходу па рэспубліцы на працягу 20 дзён, сумесна з беларускімі пісьменнікамі).*

*14. Удзел вялікай групы пісьменнікаў у Тыдні савецкай літаратуры сярод пагранвойск Заходняй акругі.*

*15. Сотні літаратурных выступленняў на заводах, новабудоўлях, у калгасах і навучальных установах, перад слухачамі універсітэтаў культуры, у час якіх прапагандаваліся рашэнні нашай партыі па ідэалагічных пытаннях, лепшыя здабыткі беларускай і ўсёй савецкай літаратуры, расказвалася, над чым працуюць зараз пісьменнікі, што робяць, каб выканаць свой высокі і пачэсны абавязак перад народам...»*

Але ж літаратура, мякка кажучы, — гэта не толькі і далёка не колькасць мерапрыемстваў, сходаў і пасяджэнняў. І зусім не колькасць сустрэч... Мастацкая літаратура — гэта самі творы, раманы, аповесці, апавяданні, паэмы, вершы, п'есы, напісаныя ў цішыні кабінетаў альбо ў іншых умовах, створаныя дзякуючы таленту і натхненню адораных асоб... Чым жа найперш у гэтым плане мог пахваліцца Саюз пісьменнікаў Беларусі? Якія мастацкія здзяйсненні характарызавалі літаратурны працэс Беларусі за 1963 год?..

Чытаем у дакладной запісцы Міколы Ткачова: *«У часопісах надрукаваны вялікія падборкі новых вершаў Петруся Броўкі, Максіма Танка, Анатоля Астрэйкі, Сяргея Грахоўскага, Кастуся Кірэенкі, Міколы Аўрамчыка, Антона Бялевіча, Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, Еўдакіі Лось, вершы многіх маладых паэтаў. Паэт Анатоль Вялюгін закончыў паэму аб юначых гадах Ул. І. Леніна «Вецер з Волгі». Паэму аб людзях і справах нашай сённяшняй навукі «Асенняя аповесць» змясціў Алесь Бачыла. Пра гераічнае мінулае ў барацьбе працоўных расказвае Алесь Бажко ў сваёй паэме «Татры».*

Кароткае адступленне... Алесь Бачыла, часопісную публікацыю паэмы якога згадвае Мікола Ткачоў, літаральна праз пару гадоў, у 1966-м, напісаў сапраўды «праграмны» верш — «Аматарам літдыскусій». Дазволім сабе яго працытаваць: *«Пустога шуму не выношу. / Чым пляскаць пугай па вадзе, — / Білет у рукі і на пошук. / Жыццё ні ў чым не падвядзе. / Для новых фактаў частаколу / Не ўзводзь дарэмна без пары. / Сабе ў падмогу, як геолаг, / Разлікі цвёрдыя бяры: / Што адкладалася па эрах, / Ў якіх разрэзах і пластах, / Каб не ліпела ўсё на веры, / Як той дзядоўнік на хвастах. / Мы часта гонімся за модай, / Нібы яна ўжо — соль зямлі; / Сядзім, наседжваем на сходах/ На мяккім месцы мазалі. / Узводзім спрытна маўзалеі / Пустапарожняе хвалы / Ці коцім нуднага ялею / Нам непатрэбныя валы. / Ці славім шэрасць пад сурдзінку — / На лаўры кожны з нас хіцёр — / Перахваратць не ўспеем свінку, / Як схопім коклюш ці адзёр. / Слупок пад сорак узлятае, / А ўсё шуміць, гудзе Парнас, / Ад бурных спрэчак аж хістае. / Паглядзіш збоку: божа мілы, / На людзях твару не відаць, / І... усміхнешся: тыя б сілы / На творы новыя аддаць».*

І хоць пошуку «новых твораў» шмат што замінала, 1963 год усё ж прынёс свой плён... З дакладной запіскі Міколы Ткачова: *«Новыя апавяданні, аповесці, раманы напісаны беларускімі празаікамі. Вось некаторыя з гэтых твораў:*

*Раман Івана Шамякіна «Сэрца на далоні» — пра ўчарашні і сённяшні дзень нашага народа, у прыватнасці, нашай інтэлігенцыі.*

*Раман Янкі Брыля «Птушкі і гнёзды», у якім аўтар вырашае праблемы патрыятызму нашага народа, любві да роднага краю, да Радзімы, асуджае ненавісны чалавецтву фашызм.*

*Раман Піліпа Пестрака «Серадзібор» пра справы калгаснай вёскі, пра вучоных сельскагаспадарчай навукі.*

*Раман Алеся Савіцкага «Жанчына» — твор, напісаны на матэрыяле жыцця рабочага калектыву Полацкага завода шкловалакна.*

*Раман Міколы Лобана «Шэметы» (другая кніга) — з барацьбы беларускага народа за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.*

*Аповесць Рамана Сабаленкі «Былое застаецца ў сэрцы» — пра мужнасць савецкіх людзей, пра іх адданасць сваёй Радзіме.*

*Новыя аповесці Лідзіі Арабей, Алеся Асіпенкі, Уладзіслава Нядзведскага і Міколы Ваданосава прысвечаны тэмам удзелу моладзі ў Вялікай Айчыннай вайне і ў сённяшніх стваральных справах народа...»*

Трэба адзначыць і разумнасць аўтара, і яго жаданне не накручваць, скажам так, сітуацыю... Бо па тым часе, пасля згаданых «хрушчоўскіх» сустрэч, пэўна ж, і ў беларускім ЦК чакалі канкрэтных прозвішчаў... Аўтар дакладной запіскі спярша абышоўся агульнымі фразамі: «...*Над новымі творамі працавалі пісьменнікі, у творчасці якіх былі адзначаны нашай крытыкай асобныя недахопы. Надрукаваныя імі творы паказваюць, што яны ўлічваюць справядлівую партыйную крытыку».* А пасля ўдакладніў, што ўсе, хто трапіў пад нож крытыкі, сталі на шлях «мастацкага выпраўлення»... *«Добрыя навелы і нарысы з жыцця шахцёраў Салігорска змясціў у друку Аляксей Кулакоўскі. Пісьменнік наладзіў сувязь са сваімі героямі і натхнёна піша пра іх.*

*Новыя вершы, апублікаваныя Алесем Наўроцкім, сведчаць, што паэт набывае страснае грамадзянскае гучанне.*

*Уладзімір Караткевіч напісаў кінасцэнарый пра мужнасць савецкай жанчыны, які прыняты да пастаноўкі кінастудыяй «Беларусьфільм». Пісьменнік таксама працуе над новым раманам на гістарычную тэму.*

*Пісьменнікі Барыс Сачанка, Іван Пташнікаў і Іван Чыгрынаў, якія ў свой час дапусцілі ў сваіх творах пэўныя памылкі, напісалі новыя рэчы і здалі да друку. Як паведамляюць з рэдакцый, гэтыя творы пакідаюць добрае ўражанне, сведчаць, што іх аўтары ўлічылі крытычныя заўвагі».*

На гэтым Мікола Ткачоў паставіў кропку. Наперадзе былі новыя часіны. Ужо ў 1964-м да беларуска чытача прыйшлі зусім новыя раманы, убачылі свет новыя кнігі. Сярод іх — і легендарная мемуарная аповесць Максіма Лужаніна «Колас расказвае пра сябе», аповесць Івана Пташнікава «Лонва», кніга прозы Барыса Сачанкі «Зямля маіх продкаў»... У перыядычным друку з'явіліся паэтычныя творы Рыгора Барадуліна, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Алеся Бачылы, Аркадзя Русецкага — творы, якія знаходзяць свайго чытача і сёння, якія і цяпер служаць мастацкімі арыенцірамі для наступнікаў па беларускіх літаратурных сцяжынах...



**Сярод пытанняў, якія разглядаў Прэзідыум СП БССР 60 гадоў назад, быў і раман У. Караткевіча «Леаніды не вернуцца да Зямлі», які выйшаў асобнай кнігай пад новай назвай толькі ў 1982 годзе.**

**Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ,**
**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

Нясумнае чытанне

# ДУДА, МЯЦЕЛІЦА, КРУПЕНЯ...

## Народны быт у «Тарасе на Парнасе»

**Зусім хутка чарговы Дзень беларускага пісьменства прыме Гарадок, што на Віцебшчыне. Усе будуць успамінаць там пра славутага земляка, аднаго з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры Канстанціна Вераніцына і яго геніяльны твор «Тарас на Парнасе».**

Што праўда, аўтарства паэмы, якая распаўсюджвалася ананімна, устаноўлена зусім нядаўна, найперш дзякуючы знакамітаму літаратуразнаўцу Генадзю Кісялёву. А паэма і ў свой час была дужа папулярнай: упершыню яе апублікавалі ў 1889 годзе, але і дагэтуль яна перапісвалася ад рукі, вучылася на памяць. Беларуская мова, якой адмаўлялі ў праве на існаванне, гучала там сакавіта, багата, спалучэнне антычных міфаў з сялянскім бытам — падобнае было ў модзе — выклікала цікавасць да простага беларуса як да асобы з пачуццём годнасці і гумару, носьбіта ўнікальнай культуры. Пасля першай жа публікацыі адбылося яшчэ некалькі, у 1896-м у Віцебску паэма была выдадзена брашурай у 15 аркушаў вялікім па тым часе накладам — тысяча асобнікаў. Потым перавыдадзена ў Гародні, потым двойчы ў Магілёве, потым двойчы зноў у Віцебску... Людзі шчыра рагаталі над прыгодамі палясоўшчыка Тараса, гадаючы, хто ж паэт. А самавіты стацкі саветнік, супрацоўнік Міністэрства шляхоў зносін у канцылярыі міністра Канстанцін Васілевіч Вераніцын жыў у Пецярбургу па адрасе Поварскі завулак, 12, і, магчыма, не падазраваў, што гарэзны твор, напісаны ім у студэнцкай маладосці, набыў такую папулярнасць.

Калі мы гаворым пра яшчэ адзін знакавы твор беларускай літаратуры — паэму Якуба Коласа «Новая зямля», мы называем яе энцыклапедыяй сялянскага жыцця беларусаў. Але і папярэднік Коласа Канстанцін Вераніцын даў у сваім няхай карацейшым тэксце цэлую панараму народнага жыцця — стравы, гульні, танцы, музычныя інструменты, традыцыі, святы, адзенне, прадметы быту... Магчыма, Канстанцін Міцкевіч якраз і натхняўся творам свайго цёзкі.

Стацкі саветнік добра ведаў жыццё простага народа — бо паходжаннем быў з прыгонных, незаконнанароджаны сын пана. Сам усё жыццё — паміж панамі і прасталюдцамі... Можа, гэта пацвярджае інтэрпрэтацыю Пятром Васючэнкам адносін палясоўшчыка Тараса з багамі, у якіх гасцяваў на Парнасе: «Ён ім нічым не абавязаны. Накармілі, напаілі — ён ім за гэта пад дуду патанчыў і — бывайце, да новых сустрэч. Час ідзе, старыя багі саступаюць месца новым, а ён, не мужык і не пан, застаецца пры сваёй лясной службе».

Давайце ж перачытаем паэму «Тарас на Парнасе» менавіта як энцыклапедыю жыцця народа і вылучым самыя яркія «экспанаты».

### «МЯЦЕЛІЦА»

Адзін з самых яркіх эпізодаў паэмы — калі

*«Узяўшы хустачку, Вянера*
*Пайшла «Мяцеліцу» скакаць.*
*Прыгожа, стройна цераз меру,*
*Пяром не можна апісаць.*
*Чырвона, тоўста, круглаліца*
*І вочы, як на калясе,*
*Як жар, гарыць яе спадніца,*
*Істужкі ўплецены ў касе».*

Менавіта гэты фрагмент цытуе Уладзімір Караткевіч у сваёй кнізе «Зямля пад белымі крыламі».

Што ж гэта за «Мяцеліца» такая? Пра яе ж нават Янка Купала пісаў у паэме «Безназоўнае», у сцэне пра «заручыны вясельніцы засмучанай з вясёлым жаніхом»:

*«Лявоніха... Мяцеліца...*
*Без памяці вяселяцца...*
*— Гэй, дзьмі ў дуду, дудар!*
*Аколіца-аселіца*
*Пад ногі сонцам сцелецца...*
*Збудзіўся гаспадар!..»*

Вераніцын згадаў старажытны народны беларускі гульнявы танец, у якім хутка змяняліся фігуры і былі шматстайныя кружэнні, што і нагадвала мяцеліцу.

«Збіраюцца ў пары, бяруць у рукі махрачкі, г. зн. ручнікі або паясы, становяцца



ў рад. Пачынаецца музыка і напеў, і ў адно імгненне ўзнімаецца сапраўдная мяцеліца. Усе пары кідаюцца раптам, першая, якая праскочыла пад ручніком, прапускае другую пару, трэцюю, чацвёртую і г. д., другая, якая праскочыла пад ручніком, прапускае трэцюю пару, трэцяя пара — чацвёртую і г. д. Усё гэта робіцца з неймавернай хуткасцю і ўсімі парамі разам. Трэба здзіўляцца, як зладжана, хутка і нават зграбна адбываецца гэта мітусня...» — з запісаў Паўла Шэйна. Прыпеўкі спявалі накшталт:

*«А мае ж вы дзяўчаткі,*
*Пусціце пагрэцца.*
*На вуліцы мяцеліца,*
*Няма дзе падзецца».*

Танец вясёлы, гарэзны — так што Венера магла паказаць сябе ва ўсёй красе. Мусіць, і юны Канстанцін Вераніцын не раз браў у ім удзел. «Мяцеліцу» любіў танцаваць і стваральнік першага беларускага вандроўнага тэатра Ігнат Буйніцкі, як пісалі ў рэцэнзіі на выступленне яго трупы: «Танцоры, хлопцы і дзяўчаты пад кіраўніцтвам Буйніцкага, падабраліся такія, што аж сцэна грымела ад заліхвацкага тупату і ў вачах мільгацела, як танцавалі «Лявоніху», «Мяцеліцу» або калі дзесяць прыгожа апранутых пар завіваліся даўгім хвастом у «Вераб'і».

*«Ці «Мяцеліца», ці «Юрка»,*
*«Мельнік», ці «Антошка», —*
*Усё ў яго сыходзіць гладка,*
*Не змыліць ні трошка»* — азваўся Купала ў 1911-м у вершы, прысвечаным Ігнату Буйніцкаму. Танцавала ў той «Мяцеліцы» ў трупе Буйніцкага і будучая жонка Янкі Купалы, Уладка Станкевічанка. Ці не таму згадваецца танец у пазнейшай паэме яе мужа?

### КРУПЕНЯ

Як ядуць на Парнасе багі, аўтар апісвае са смакам: калі ўспомніць, што быў ён тады вечна галодным студэнтам, тое не дзіўна. Ядуць багі стравы беларускай народнай кухні. Прыслуга дзеўка Геба

*«На малацэ крупеню густу*
*Дае ўволю, толькі еж».*

Давялося тае крупені пакаштаваць і Тарасу, бо і багі трымаюцца беларускага звычаю: нельга ж выпраўляць няхай і нечаканага госця дахаты, не накарміўшы:

*«Кіўнуў Зевес — і мігам Геба*
*Крупені ў міску наліла*
*І добрую краюху хлеба,*
*Сказаўшы: «Еж», — мне падала.*
*Крупені смачнай пахлябаўшы,*
*Усіх падзякаваў багоў;*
*Кашэль за плечы прывязаўшы,*
*Сабраўся ўжо ісці дамоў».*

Крупеню, пра якую ідзе гаворка, часам называюць галоўнай беларускай сялянскай стравай таго часу. Яе варылі найчасцей з ячных альбо прасяных круп, забельвалі малаком, маглі зварыць з мясам і бульбай.



На Ільін дзень гатавалі з іржаной мукі, адзначаючы першы збор яшчэ маладога жыта.

Можна сустрэць сцверджанні, што крупеня і крупнік — сінонімы. Тут галоўнае не паблытаць: бо так, ёсць крупнік — тая самая крупеня, нешта сярэдняе паміж поліўкай і другой стравай. Чым багацейшая сям'я, тым больш густым стараліся варыць крупнік — каб лыжка стаяла. А ёсць крупнік — нешта сярэдняе паміж поліўкай і моцным алкагольным напоем. Рабілі на гарэлачцы з дадаваннем мёду, ягад, арэхаў, апельсінавых скурак, пялёсткаў руж ды на што фантазіі хопіць. І нярэдка менавіта сумесным спажываннем крупніку заканчваліся сваркі. У «Пінскай шляхце» прымірэнне ганарыстых шляхцюкоў суправаджаецца каментарыем суддзі Кручкова: «На згоду каб быў крупнік». І ён з'яўляецца: дзве гераіні, Куліна і Марыся, уносяць дзве міскі гарачага крупніку і ставяць на стол. Куліна кажа, што сама зладзіла гарэлку, «шафрану і розных прыпраў насуліла многа, мёду ж цэлы кадоўбчык укінула».

Але Тараса на Парнасе частавалі крупеняю на малацэ, так што ап'янець яму ад яе не ўдалося. А ў сучасных беларускіх рэстаранах можна знайсці крупеню і звараную на мясе, і беленую, і з грыбамі.

### ДУДА

*«Во... разам у дуду зайгралі,*
*Скакаць багіні пачалі».*



Ігранне дуды суправаджае гасцяванне Тараса.

*«Глядзеў Юпітар і дзівіўся,*
*І пад дуду ў далоні біў.»*

Хто не чуў іграння старадаўняй беларускай дуды — шмат страціў. У голасе гэтага музычнага інструмента гучыць сама гісторыя. Дуда — фактычна тая ж валынка. Скураны мех, дудачка-жалейка, адзін-два «гукі» — бурдонныя трубы. Без дуды не абыходзіліся ніякія святы, ад «Жаніцьбы Цярэшкі» да абыходаў двароў на Вялікдзень. Падчас археалагічных раскопак у Віцебску знайшлі пацвярджэнне, што дуда на нашых землях існавала з XIII—XIV стагоддзяў.

Мы не знаходзім партрэта дудара ў творы Вераніцына, але дудар у беларускай міфалогіі — постаць сакральная. У рамане Уладзіміра Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» ёсць персанаж — Дудар: «здравіла..., толькі што худзейшы ды валасы занадта доўгія... у бялюткай, як снег, світцы і ў данельга заляпаных гразёю поршнях. Цераз плячо — казіныя мяхі вялізнай дуды». Гранне Дудара суправаджае падзеі рамана. Вось яго дуда высмейвае зладзея: « — Дзіур-лі-бе-бе-бе-бя-бя, — непераймальна, да самых нізкіх гукаў спускаючыся, прабляяла яму наўздагон дуда. Нібы вялізны дурны баран аддаваў Пану Богу садухі». Вось заклікае людзей да бойкі: «Шалёна зараўла над галовамі дуда... мядзведзем зараўла сярод імклівага шалёнага кліна дуда». А ў апошняй сечы, калі гараджане абараняялі свой вольны горад, ігранне дуды робіцца сімвалам змагання: «Дык няхай той, хто самотна б'ецца, ведае — астатнія трымаюцца. Пакуль дуда раве — яны трымаюцца...»

### ГУЛЬНЯ Ў ТРОНКІ

*«На грошы ў тронкі тут гуляюць*
*Парнаскі хлопцы-дзецюкі,*
*А хто капейкі з іх не мае,*
*Той лупіць проста ў шлягі».*



У каментарах да паэмы пазначана, што шлягі — гульня ў пстрычкі, назва ўтвораная ад нямецкага слова. А вось што такое тронкі?

Аказваецца, гульня з каменьчыкамі альбо шарыкамі, змест якой у тым, каб пацэліць з рукі трыма алавяннымі шарыкамі ў ямку, што знаходзіцца ад гульца на пэўнай адлегласці. Для гульні ў тронкі выкарыстоўвалі звычайныя каменьчыкі, гліняныя, алавяныя ці драўляныя шарыкі. Дзесьці іх ужывалі велічынёй з круглую кулю ад стрэльбы, часам — памерам з арэх. Месцамі на Беларусі тронкамі называлі маленькія бульбінкі — мусіць, дзеці падчас выбірання бульбы скарыстоўвалі іх для гульні. Напэўна, і Кастусь Вераніцын у свой час таксама нагуляўся ў тронкі...

### СВЯТА КАЗЬМЫ І ДАМІЯНА

*«На самага Кузьму-Дзям'яна*
*Пайшоў я біць цецерукоў.*
*Устаў я нешта дужа рана, —*
*Здаецца, з першых петухоў».*

Так пачынае палясоўшчык Тарас распавед пра свае прыгоды.



«Кузьма і Дзям'ян» — прысвятак народнага календара, адзначалі яго двойчы на год, 14 ліпеня і 14 лістапада (падзеі паэмы адбываюцца на восеньскі прысвятак). Святыя бяссрэбранікі лекары Казьма і Даміян, браты-блізнюкі арабскага паходжання, лячылі бясплатна і загінулі за хрысціянскую веру, пад іх нябеснай апекай — дактары і блізняты. У народзе яны лічыліся апекунамі кавалёў, а яшчэ памагатымі ў сенакосе і падрыхтоўцы да жніва, а таксама ў малацьбе. «Кузьма з Дзям'янам на восень содзяць, на помач просяць малыя сляткі: «Бярыце цацкі». Верылі, што Кузьма і Дзям'ян спрыяюць вяселлям, бо дапамогуць «скаваць» моцную сям'ю. Месцамі нават гулялі ў «Кузьму» — на вячорках моладзь рабіла саламяна чучала, з якім «жанілі» якую-небудзь дзяўчыну. А вось палясоўшчык Тарас замест таго, каб ушанаваць святых, пабег зранку ў лес біць цецерукоў. Ці не таму і напаткаліся яму розныя здані?

Перачытайце ж паэму і ўсміхніцеся яшчэ раз таленту аўтара!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Шануй сваё

# Крэпасць, палацык, аптэка і смаўжы

## Захапляльнае падарожжа па Брэсцкай вобласці

**Сезон водпускаў яшчэ не скончыўся, надвор'е дазваляе... Куды адправіцца ў летні адпачынак, каб правесці гэты час з карысцю? «Звязда» разам з Нацыянальным агенцтвам па турызме адправілася ў падарожжа па Брэсцкай вобласці і ўжо гатовая расказаць вам пра самыя выдатныя аб'екты ўнутранага турызму.**

### Хоць не палац, але — палацык

Калі вас цікавіць, як калісьці жыла шляхта ў Беларусі, то ў нас для вас ёсць цудоўны аб'ект: музей-сядзіба «Пружанскі палацык» (той самы, у якім былі зняты першыя кадры фільма «Брэсцкая крэпасць»).

Пружанскі палацык называюць унікальным, таму што гэта адзіная ў Беларусі сядзіба стылю мадэрн другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзя, вонкавы выгляд якой не змяніўся з часоў пабудовы. Таму ёсць пацвярджэнне ўнутры самога палацыка. На яго сценах сярод карцін можна знайсці копію работы Напалеона Орды, які ў 1870 г. захаваў на сваім палатне аблічча сядзібы.

Цяпер гэта музейны будынак, чые аднаўленыя інтэр'еры дапамагаюць уявіць: калісьці тут праходзілі шыкоўныя балі Валенція Швыкоўскага, маштабныя сустрэчы...

Але ж музей-сядзіба «Пружанскі палацык» не абмяжоўваецца тэмай шляхецкага быту. Тут можна знайсці і цікавую экспазіцыю, якая адлюстроўвае ўсе народныя рамёствы, папулярныя на дадзенай тэрыторыі, і рэлігійныя рэліквіі. Вельмі ўразіла сваёй натуральнасцю і душэўнасцю экспазіцыя з творамі самабытнага майстра разьбы па дрэве Мікалая Тарасюка. Мастацкі погляд аўтара кранае сваёй прастатой і праўдзівасцю. Яго творы — сапраўдная энцыклапедыя вясковага жыцця з усімі яго радасцямі і нягодамі.

### Нестандартная ферма

Дапусцім, на шляхецкія сядзібы вы ўжо наглядзеліся. Чым жа такім незвычайным разбавіць падарожжа па Брэсцкай вобласці? Вядома ж, наведваннем фермы смаўжоў «ПіліпУлі», што за 7 км ад Брэста.

Сямейная смаўжовая ферма з'явілася ў вёсцы Падлессе Радваніцкае ў 2019 годзе. Вы можаце запытацца, навошта разводзіць смаўжоў, калі іх і так поўна навокал... Усё не так проста. Рэч у тым, што ферма спецыялізуецца на развядзенні і вырошчванні міжземнаморскіх смаўжоў хелікс асперса мюлер і хелікс асперса максіма. Дарэчы, яны піянеры ў Беларусі ў такой справе. Таксама на ферме ёсць некалькі смаўжоў-ахацін. Яны здольныя вырасці ажно да 25 сантыметраў (гэта больш, чым далонь дарослага чалавека!).

Прыязджаем, і адразу ж сюрпрыз: нас чакаў ну зусім незвычайны смоўж. Дакладней, аніматар у гарнітуры смаўжа. Харызматычная дзяўчына сваім апавяданнем пагрузіла ўсіх прысутных у дзіўны свет смаўжовай фермы. У ходзе экскурсіі яна расказала шмат цікавай інфармацыі пра смаўжоў. Напрыклад, ці ведалі вы, што гэтыя істоты здольныя пераносіць вагу ў дзесяць разоў цяжэй за іх саміх? Таму смаўжу зусім не складана перацягнуць на сабе сабрата, які раптоўна вырашыў пракаціцца. Таксама ў экскурсіі была і інтэрактыўная частка: госці фермы маглі пакратаць гадаванцаў, пасадзіць іх сабе на руку і нават пакарміць. Але вуха трэба трымаць востра і запамінаць усё, што кажа вялікі «смоўж»-аніматар. Бо ў праграму экскурсіі ўключана віктарына. Сярод цікавага тут яшчэ ёсць спаборніцтвы па сартаванні смаўжовай ікры, смаўжовыя скачкі. У асноўным ферму наведваюць дзіцячыя экскурсіі. На іх і накіравана забаўляльная праграма. Аднак дарослым тут таксама не будзе сумна: для іх прадугледжана дэгустацыя смаўжоў «Эскарга» і канапэ з ікрой смаўжоў.



### Прагулка па Брэсце

Але што ж мы ўсё ездзім кругом ды навокала абласнога цэнтра. Давайце ж нарэшце зазірнём у Брэст і прагуляемся па яго старадаўніх вулачках.

Падчас вандровак важна вучыцца зважаць на дэталі. Многія брастаўчане і госці горада праходзяць міма прыгожага цаглянага будынка філалагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта і нават не падазраюць, што ў будынічным матэрыяле ў літаральным сэнсе запісана гісторыя. Тут лёгка можна знайсці цэглу з надпісам AR, што азначае «Арон Рабіновіч» (гаспадар цаглянай мануфактуры), значна больш складана адшукаць цаглінку з адметным подпісам нейкага даўняга студэнта, але паверце, яна таксама ёсць недалёка ад увахода ў будынак.



Пасля такога падарожжа склалася ўражанне, што ў кожнага будынка ў Брэсце — своя дзіўная гісторыя. Узяць як прыклад аптэку № 3, размешчаную на вуліцы Савецкай. Вонкава яна выглядае як просты трохпавярховы будынак. Але ж у яго адметная гісторыя, найперш сваім пастаянствам. Справа ў тым, што тут заўжды была аптэка. Яна была пабудавана ў 1925 годзе архітэктарам Саламонам Грынбергам. Першы паверх быў адведзены пад аптэку, дзе жонка архітэктара Фана Абрамаўна была правізарам, а верхнія два служылі жыллём сям'і Грынбергаў. Спачатку аптэка была прыватнай, пасля яе нацыяналізавалі. Але факт застаецца фактам: будынак ніколі не мяняў свайго першапачатковага прызначэння. Сёння, як і шмат гадоў таму, яе дзверы таксама адчыненыя для наведвальнікаў.

А яшчэ мы вельмі рэкамендуем затрымацца на Савецкай да вечара і паглядзець на тое, як знакаміты брэсцкі ліхтаршчык выконвае сваю работу. Гэта сапраўды каларытнае відовішча. Вось ужо 14 гадоў на галоўнай пешаходнай вуліцы горада Віктар Кірысюк кожны дзень запальвае і гасіць старадаўнія ліхтары, у кожным з якіх размяшчаецца газавая лямпа. У гэтага рытуалу амаль заўсёды ёсць гледачы, але тое ніяк не перашкаджае ліхтаршчыку ў форме пятроўскіх часоў выконваць сваю задачу. Наадварот, ён з задавальненнем фатаграфуецца з людзьмі і дае ім пацерці гузік на сваёй форме (кажуць, што гэта выконвае запаветныя жаданні).

### Сляды вайны

Пагадзіцеся, цяжка ўявіць турыстычную паездку ў Брэст без наведвання мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Нават звычайная прагулка па тэрыторыі мемарыяла пакідае незабыўныя ўражанні. Чаго вартыя толькі скульптурныя кампазіцыі «Смага» і «Мужнасць»! Але мы — турысты дапытлівыя, таму вырашылі дадаткова наведаць «Музей вайны — тэрыторыя міру».

На ўваходзе ў экспазіцыю нас сустракае сям'я пехацінца. Вайна яшчэ не пачалася. Над галавой наведвальнікаўззяе зорнае неба. Дарэчы, нябесныя целы на ім размешчаныя якраз так, як у тую фатальную ноч перад пачаткам вайны. Кожная зала мае сваю тэму. Чым далей праходзім, тым больш паглыбляемся ў гісторыю абароны Брэсцкай крэпасці. Уражлівым людзям у адзіночку тут давядзецца цяжка. Пры мігатлівым святле экспазіцыі фігуры людзей выглядаюць як жывыя. А адпаведнае гукавое суправаджэнне яшчэ глыбей перадае атмасферу баёў чэрвеня-ліпеня 1941 года. Адмысловую каштоўнасць маюць гукавыя купалы з успамінамі відавочцаў у зале «Прызнанне». Гэта быццам машына часу: становішся пад іх, і кранальныя апавяданні ветэранаў заносяць далёка-далёка...

